

КНІЖНЫЯ ТРЭНДЫ ДЛЯ МАЛЕНЬКІХ ІНТЭЛЕКТУАЛАЎ «Сямейная газета»

НАВАГОДНІЯ ЎСПАМІНЫ ТРОХ ПАКАЛЕННЯЎ «Сямейная газета»



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 СНЕЖНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 249 (28865)

**ЛІЧБА ДНЯ**

**Br994**

*склала намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў лістападзе гэтага года, паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт. Сталіца ў разрэзе рэгіёнаў традыцыйна лідзіруе па гэтым паказчыку: сярэдняя зарплата работнікаў Мінска за лістапад сфарміравалася ў памеры Br1375,3 (тэмп росту да лістапада 2017 года — 112,8 %). У Мінскай вобласці яна склала Br994,7 (113,5 %), у Гомельскай — Br895,7 (111,9 %), Брэсцкай — Br867 (112,8 %), Гродзенскай — Br863,7 (113,9 %). Сярэдні заробак у Віцебскай вобласці — Br838 (111,2 %), у Магілёўскай — Br836,3 (111,2 %). У цэлым па краіне рэальная заработная плата (заработная плата, разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) у студзені — лістападзе 2018 года ў параўнанні з адпаведным перыядам 2017 года ўзрасла на 12,4 %.*

# Ёлачка для Караліны



Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

**Прадаўцы ёлачнага кірмашу Максім КІСЯЛЁЎ і Аляксей ШАРАНДА прапаноўваюць мінчанам статныя і пышныя дрэўцы, адмыслова выгадаваныя для ўпрыгажэння навагодняга свята і прывезеныя з Брэсцкай вобласці. Сярод пакупнікоў перадсвяточнага кірмашу, які размясціўся на сталічнай вуліцы Варанянскага, была ўчора і чатырохгадовая Караліна КУНЦЭВІЧ са сваёй хроснай матуляй Альбінай ШКЛЯР.**

Напярэдадні

## МАЙСТАР-КЛАС КАЛЯ НАВАГОДНЯЙ ЁЛКІ

У Магілёве з'явілася зялёная прыгажуня, цацкі для якой зрабілі сваімі рукамі вядомыя ў горадзе людзі

**— Вунь, бачыце, тое медзведзяня змайстраваў загадчык хірургічнага аддзялення магілёўскай гарадской бальніцы № 1 Дзмітрый Сарокін, а гэты сюррэалістычны анёл выйшаў з-пад рук улюбёнца тэатральнай публікі Магілёва Уладзіміра Пятровіча, сняжынкі канструяваў Юрый Стукалаў, кіраўнік Цэнтра гарадскіх ініцыятыў, са сваімі аднадумцамі па праекце «Цяпліца», — разам са старшынёй магілёўскага грамадскага аб'яднання «Шчырая майстэрня» Алай СМАЛЯКОВАЙ разглядаем упрыгожаную самаробнымі цацкамі ёлку. Якая ж яна незвычайная, а галоўнае — эксклюзіўная! Ну і выдумшчыкі ж гэтыя майстры. Не даюць засумаваць. І іх навагодні праект «Калі елкі былі вялікія», які па традыцыі праводзіцца ў горадзе напярэдадні свята, нікому яшчэ не быў падобны на папярэдні. Ранейшым застаецца толькі месца дзеяння — гарадская выставачная зала па вуліцы Болдзіна. Менавіта тут аднымі з першых запальваюцца навагоднія ёлкі і пачынаецца выстаўка-кірмаш з падарункамі і сюрпрызамі. Праект вяртае ў атмасферу дзяцінства і дазваляе стаць крыху чараўніком, крыху дзіцем, крыху майстрам. Летась, напрыклад,**



Ала СМАЛЯКОВА дэманструе анёла з дызайнерскай ёлкі.

**сюды запрашалі вядомых у горадзе людзей, каб яны прачыталі ўрыўкі з твораў любімых аўтараў. А сёлета вырашылі правесці серыю майстар-класаў. Такім чынам можна і пра сябе нагадаць, і магілёўчанам падказаць, як не сумна сустрэць Новы год. Карэспандэнт «Звязды» паназірала за працэсам. Урок якраз брала намеснік старшыні Магілёўскага гарвыканкама Ала ГАЛУШКА.**

СТАР. 4

Перадаць эстафету

## НА «СКРЫЖАВАННІ» ТАЛЕНТАЎ І МАСТАЦТВАЎ



**Пінск пачынае шэраг мерапрыемстваў у статусе культурнай сталіцы — 2019**

**Тое, што ў Пінску нядаўна з'явілася скульптура палешука-пінчука, выглядае надзвычай сімвалічна. Гэты чалавек з барадой у капелюшы і палескай світе, падпяразаны поясам, нясе ў сабе своеасаблівы культурна-гістарычны код, сфарміраваны многімі пакаленнямі тутэйшых людзей.**

— Ці ведаеце вы, як сярод іншых людзей распазнаць сапраўдных «пінчукоў»? — пытаецца **вядомы краязнавец і даследчык Таццяна ХВАГІНА** і адказвае: — Дзе б ні сышліся вашы шляхі — у Еўропе, Азіі ці Амерыцы, — калі справа дойдзе да знаёмства, сапраўдны пінчук, загнуўшы мезенец, з годнасцю пачне: «Па-першае, я з Пінска...», нібыта ўвесь свет павінен ведаць, дзе знаходзіцца Пінск і менавіта што з'яўляецца падставай для таго, каб ганарыцца сваім пінскім паходжаннем. Бо для тых, каго з дзяцінства калыхала на сваіх хвалях ласкавая Піна, хто бегаў басаном па пінскіх вулачках і завулках, сталеў сярод сівых мурோў, Пінск — гэта не проста кропка на карце, а амаль што пуп зямлі». Вось гэтае прыгожае азначэнне пінчука, зробленае Таццянай Хвагінай, стала ідэйнай асновай скульптуры Аляксея Паўлючыка. Пінчук стаіць менавіта загнуўшы мезенец.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

**Кожны дзень – са «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2019 года, — у падарунак 4 календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы**



Блізкая ўлада

# Пільная ўвага — на добраўпарадкаванне

**Тэма якасці і бяспекі дарог была ўзнята падчас прамой тэлефоннай лініі губернатара Гродзенскай вобласці з жыхарамі рэгіёна**

Шматдзетная мама Алена Вітольдаўна з Гродна і яе сям'я некалькі гадоў пражывае ў новым тыпавым пасёлку катэджнага тыпу «Ласосна-4», які пабудаваны за горадам. Па словах жанчыны, жылы мікрараён адпавядае ўсім нормам пражывання — падведзены ўсе камунікацыі, тэрыторыя добраўпарадкавана. Але ёсць нараканні на дарогу, якая вядзе да пасёлка. Алена Вітольдаўна ад імя жыхароў выказала занепакоенасць яе станам. Дарога звязвае пасёлак з галоўнай трасай, па якой ходзіць гарадскі транспарт. Але каб дабрацца да трасы, трэба пераадолець амаль кіламетр даволі складанай для пешахода дарогі, на якой няма ліхтароў, а само палатно патрабуе рамонту. Таксама яе непакоіць і тое, што на вуліцах пасёлка ў начны час поўнасцю адключаецца электрычнасць.



Губернатар даў даручэнне прадугледзець у жылым мікрараёне дзяжурнае асвятленне і ноччу. Што датычыцца дарогі, яе добраўпарадкаванне будзе ўзята пад кантроль як гарадскімі, так і абласнымі ўладамі.

— Зараз фарміруецца праграма развіцця на 2019 год, і мы зноў звернем увагу на гэту дарогу, — адказаў Уладзімір Краўцоў. — Магчыма, не адразу там будзе пакладзены асфальт. Але добраўпарадкуюць так, каб можна было бяспечна не толькі ездзіць, але і хадзіць. Людзі павінны без праблем дабірацца да сваіх дамоў. Гэтыя пытанні будуць у цэнтры ўвагі гарадской улады.

Губернатар адзначыў, што пытанні па дарогах узнікаюць. І ў гэтым кірунку ўлады працуюць. У апошнія гады надаецца важнае значэнне добраўпарадкаванню дарог у жылых мікрараёнах, сродкі на іх закладваюцца як у бюджэт, так і ў іншыя праграмы. Паступова пытанні вырашаюцца, хоць такіх «дарожных» адрасоў нямала. Па-ранейшаму больш за палову зваротаў датычыцца жыллёва-камунальнай гаспадаркі, ёсць пытанні і ў сферы жыллёвага будаўніцтва, накшт магчымасці набыцця жылля, крэдытавання.

— Людзі хочуць будавацца, і трэба ім у гэтым садзейнічаць. Добра, што ў краіне прымаецца нямала заканадаўчых актаў, накіраваных на рашэнне гэтай праблемы, — падкрэсліў Уладзімір Краўцоў.

Старшыня аблвыканкама паведаміў, што сёлета, дзякуючы планамернай, мэтанакіраванай рабоце ўсіх галін улады, колькасць зваротаў зменшылася на дзесяць працэнтаў.

— У канцы года мы традыцыйна падводзім вынікі, у тым ліку па такой важнай частцы дзейнасці органаў выканаўчай улады, як работа са зваротамі грамадзян. Увайшлі ў практыку прамыя тэлефонныя лініі, якія даюць магчымасць жывой гутаркі з чалавекам, у якім бы кутку вобласці ён ні пражываў. Дзякуючы такім зносінам вырашаюцца пытанні, якія пасапраўднаму хвалююць людзей, — падкрэсліў Уладзімір Краўцоў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**ИНФОРМАЦИЯ**
**о совершении крупной сделки Эмитентом**

**1. Полное наименование и местонахождение эмитента:**
Общество с ограниченной ответственностью «Темпл Сити», 220043, г. Минск, пр-т Независимости, 95/1, ком. 7.
**2. Дата принятия решения о совершении сделки:**
19 декабря 2018 года.
**3. Вид сделки (каждой из взаимосвязанных сделок):**
1. Кредитный договор
2. Договор залога недвижимого имущества (ипотека)
3. Договор залога недвижимого имущества (ипотека)
**4. Предмет сделки:**
Денежные средства на осуществление финансово-хозяйственной деятельности.
**5. Сумма сделки (общая сумма взаимосвязанных сделок):**
1 390 000,00 (один миллион триста девяносто) евро 00 евроцентов.
**6. Стоимость имущества, приобретаемого (отчуждаемого) по сделке:**
1 390 000,00 (один миллион триста девяносто) евро 00 евроцентов.
**7. Балансовая стоимость активов** (стоимость активов), определенная на основании данных бухгалтерской (финансовой) отчетности за последний отчетный период (3 квартал 2018 года) составляет 4 761 000,00 (четыре миллиона семьсот шестьдесят одна тысяча) белорусских рублей 00 копеек.
УНП 192280260

**ИНФОРМАЦИЯ**
**о совершении крупной сделки Эмитентом**

**1. Полное наименование и местонахождение эмитента:**
Общество с ограниченной ответственностью «Темпл Сити», 220043, г. Минск, пр-т Независимости, 95/1, ком. 7.
**2. Дата принятия решения о совершении сделки:**
19 декабря 2018 года.
**3. Вид сделки (каждой из взаимосвязанных сделок):**
Договор купли-продажи доли в уставном фонде ООО «ТЕТ Пассаж»
**4. Предмет сделки:**
Приобретение 100 (сто) процентов доли в уставном фонде ООО «ТЕТ Пассаж».
**5. Сумма сделки (общая сумма взаимосвязанных сделок):**
1 390 000,00 (один миллион триста девяносто) евро 00 евроцентов.
**6. Стоимость имущества, приобретаемого (отчуждаемого) по сделке:**
1 390 000,00 (один миллион триста девяносто) евро 00 евроцентов.
**7. Балансовая стоимость активов** (стоимость активов), определенная на основании данных бухгалтерской (финансовой) отчетности за последний отчетный период (3 квартал 2018 года) составляет 4 761 000,00 (четыре миллиона семьсот шестьдесят одна тысяча) белорусских рублей 00 копеек.
УНП 192280260

Год малой радзімы

# ЛЮБОЎ ПАЧЫНАЕЦЦА З КЛОПАТУ

**На пытанні «Звязды» адказаў начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Генадзь ЯГОРАЎ.**



***— Генадзь Міхайлавіч, якія, на ваш погляд, самыя знакавыя падзеі і мерапрыемствы былі рэалізаваныя на Віцебшчыне сёлета?***

— Абвяшчэнне Года малой радзімы падштурхнула больш пільна прыглядзецца да праблем маленькіх вёсак, невялікіх пасёлкаў. У прыватнасці, да добраўпарадкавання вуліц і сядзіб. Упэўнены, сапраўдная любоў да радзімы пачынаецца з клопату аб ёй.

Цяжка пералічыць усе мерапрыемствы. Нават калі захочаце коратка напісаць пра кожнае, думаю, не хопіць для гэтага і цэлага нумара «Звязды»...

Сярод іншага Віцебшчына актыўна прымала ўдзел у экалагічнай кампаніі «Упрыгожым малую радзіму». Перамены да лепшага адбыліся ў пасёлку Езярышча Гарадоцкага раёна, у сельскіх населеных пунктах: Опса — Браслаўскага раёна, Вымна і Копці — Віцебскага, Мярэцкія — Глыбоцкага, Крынкі — Лёзненскага, Камаі — Пастаўскага, Чарэя — Чашніцкага раёна і гэтак далей.

Праведзены работы па ўладкаванні 475 спартыўных і дзіцячых гульнявых пляцовак, рамонце 183,5 тысячы метраў квадратных дарог, зносе 400 пустуючых і старых дамоў. Пасаджана 32,5 тысячы дрэў і кустоў, уладкавана 22 гектары газонаў.

Вялікія аб'ёмы работ па добраўпарадкаванні праведзены ў населеных пунктах Аршанскага раёна. Так, у пасёлку Балбасава адрамантаваны фасады шматкватэрных дамоў, добраўпарадкаваны дваровыя тэрыторыі, уладкаваны паркоўкі і тратуары. У гэтым населеным пункце ўстаноўлены гульнявыя пляцоўкі з дзіцячымі атракцыёнамі, пракладзены веласіпедныя і пешаходныя дарожкі, пасаджана 300 дрэў. Пабудаваная і станцыя абезжалезвання, што дазволіла палепшыць якасць пітной вады.

***— Год малой радзімы падоўжаны яшчэ на два гады. Што плануецца зрабіць у пытаннях добраўпарадкавання, аднаўлення храмаў, помнікаў архітэктуры?***

— Важна працягваць тое, што пачалі. Тыя ж работы па добраўпарадкаванні тэрыторый і навядзенні парадку на зямлі. Цяпер фарміруюцца спісы мерапрыемстваў. Асаблівая ўвага будзе аддадзена развіццю і ўладкаванню глыбінкі. Шмат чакаюць ад мясцовай улады жыхары былых райцэнтраў: Езярышча Гарадоцкага раёна, Багушэўска — Сенненскага, Дзісны — Мёрскага...

Трэба выконваць і даручэнне Прэзідэнта па добраўпарадкаванні двух раёнаў штогод. Спачатку запланавана «даць другое дыханне» Браслаўскаму і Сенненскаму раёнам. Потым — астатнім.

Распрацоўваюцца планы па пераўтварэнні аграгарадкоў у «вёскі будучыні» з улікам мясцовых асаблівасцяў. Адметна падышлі да перамен у аграгарадку Мазалава Віцебскага раёна. Спачатку на мясцовым сельгаспрадпрыемстве ўкаранілі сучасныя тэхналогіі, а потым узяліся за сацыяльную сферу. Плануецца, што ў 2019 годзе гэта будзе вёска Бароўка Лепельскага раёна, у 2020-м — аграгарадок Навасёлкі Пастаўскага раёна.

Па адраджэнні гістарычнай спадчыны ёсць цікавыя прыклады. У Дуброўне адкрылі рэканструяваны дарэвалюцыйны будынак Дняпроўскай мануфактуры — ён належыць ААТ "Дубровенскі льнозавод", які дзясяткі гадоў узначальвае дырэктар Анатоль Басянкоў. Цяпер там музей, дзе сабралі матэрыялы аб Дняпроўскай мануфактуры. Цікава, што ёсць і зала сямейных урачыстасцяў. Усе работы па рэканструкцыі будынка праведзены за ўласныя сродкі прадпрыемства...

А ў Паставах сёлета адкрылі музей, прысвечаны гісторыі аптэчнай службы. Ініцыятарам стварэння экспазіцыі стаў калектыў на чале з Жаннай Лагвіненкай, загадчыкам цэнтральнай аптэкі Пастаўскага раёна, найстарэйшай у вобласці. Будынак, узведзены больш за 200 (!) гадоў таму, неаднойчы рэканструявалі. Але захавалася непаўторнае архітэктурнае аблічча і, галоўнае, першапачатковае прызначэнне...

***— А хто з вядомых палітыкаў і бізнесменаў, дзеячаў мастацтваў дбае сёння пра сваю малую радзіму?***

— У Лёзне пры садзейнічанні старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, нашага земляка Уладзіміра Андрэйчанкі, уведзена ў эксплуатацыю другая чарга культурна-аздараўленчага цэнтра.

У Мёрах узводзіцца ўнікальны прамысловы аб'ект, металапракатны завод па вырабе белай бляхі — ТАА «ММПЗ-груп» інвесціравала 264,4 млн рублёў. Рэалізацыя гэтага праекта з'яўляецца асноўным перспектыўным і інавацыйным кірункам сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна. Старшыня савета дырэктараў названай фірмы — Аляксей Кавалёнак, ураджэнец раёна. Дарэчы, дзякуючы яму плануецца пабудаваць у Мёрах кардыялагічны цэнтр па нямецкіх стандартах для аказання экстраннай і планавай спецыялізаванай дапамогі насельніцтву навакольных раёнаў. У дадатак будуць лячыць іншаземцаў.

Шмат робіць для землякоў і Мікалай Мартынаў, член Савета Рэспублікі, генеральны дырэктар холдынга «Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марка». Прадпрыемствам аказана фінансавая дапамога на рамонт новай выставачнай залы гісторыка-краязнаўчага музея. «Марка» — пастаянны спонсар Міжнароднага фестывалю песні і музыкі «Дняпроўскія галасы ў Дуброўне» і іншых.

У вёсцы Машкова Аршанскага раёна ў рамках свята «Малая радзіма — вялікая любоў» урачыста адкрылі пасля рэканструкцыі помнік савецкім воінам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай. Ініцыятарам і спонсарам гэтага праекта стаў старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Аляксандр Забела, ураджэнец Аршаншчыны.

І аналагічных прыкладаў шмат.

***— На ваш погляд кіраўніка ідэалагічнай вертыкалі вобласці, што трэба зрабіць, каб Год малой радзімы не ператварыўся ў кампанейшчыну для справаздачы?***

— Кампанейшчыны ў такім пытанні быць не можа. Вось глядзіце, як у адной з нашых рэгіянальных газет падышлі да абвяшчэння тэматычнага конкурсу. Яны яго назвалі «Малая радзіма — дом майго сэрца». Якое цёплае сугучча слоў!

У той жа час тут важна правільна расставіць акцэнты і рацыянальна ўсё арганізаваць.

Прывяду прыклад. У лютым рашэннем Глыбоцкага райвыканкама быў зацверджаны план мерапрыемстваў па правядзенні «Года захавання гістарычнай спадчыны Глыбоччыны».

Сёлета ў Дуброўне стартаваў праект «Захаваем спадчыну разам». Ініцыятарамі сталі жыхары горада і ўдзельнікі грамадскай ініцыятывы «Дуброва». Праект прадугледжваў добраўпарадкаванне гарадскога парку «Ліпкі». Грашовыя сродкі на рэалізацыю былі выдзелены Фондам імя Льва Сапегі. Да рэвалюцыі парк належаў князю Любамірскаму, гэта было прыгожае месца прагулак для арыстакратаў. Побач знаходзіўся багаты фруктовы сад. Дарэчы, у свой час ён стаў адметнай рысай Дубровеншчыны, бо ва ўсіх сваіх маёнтках і вёсках князь Любамірскі патрабаваў, каб у кожнага жыхара дома цвілі сады.

За час рэалізацыі праекта ў парку зрабілі новыя тратуарныя дарожкі, уздоўж якіх высаджана 100 ліп. На беразе рэчкі Задубровенкі пасаджана невялікая дуброва — 100 дубочкаў. Над трэнажорным комплексам з'явіўся дах. І цяпер можна трэніравацца ў любое надвор'е. Таксама абсталявана валейбольная пляцоўка, устанавілі альтанку для адпачынку, сцэнічную пляцоўку... Усё гэта зроблена не для справаздачы.

***— Чым асабіста вам запомніўся Год малой радзімы?***

— На зямлі многа цудоўных мясцін, але няма даражэйшай сэрцу за малую радзіму. Нядаўна на маёй роднай Лёзненшчыне адкрывалі пасля рэканструкцыі мемарыяльны комплекс «Адаменская горка». Менавіта гэта падзея запомнілася больш за ўсё. Наш раён вельмі пацярпеў у гады Вялікай Айчыннай вайны — загінула звыш 5 тысяч мірных жыхароў, столькі ж землякоў не далічыліся на франтах і ў партызанскай барацьбе, было спалена 196 вёсак. Таму памяць аб загінулых жыве ў нашых сэрцах. Мы імкнёмся да яе захавання падыходзіць нефармальна. Гэта набывае асаблівае гучанне напярэдадні 75-годдзя вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

З кожным годам расце ўвага да захавання нацыянальнай спадчыны, да людзей, якія праславілі родную зямлю працоўнымі дасягненнямі і гераічнымі ўчынкамі. І надыходзячы 2019 год будзе на Віцебшчыне працягам агульнай справы на карысць нашай Айчыны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Нашы дзеці

# Дапамаглі Дзеду Марозу з падарункамі

**Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК** разам з супрацоўнікамі міністэрства напярэдадні Новага года наведаў ДУА «Дзіцячы дом № 3» г. Мінска, у якім рэалізуюцца спецыяльныя адукацыйныя праграмы для дашкольнікаў. Цяпер у гэтым дзіцячым доме пражываюць 53 дзіцяці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ва ўзросце ад 3 да 8 гадоў, з іх 33 дзіцяці-інваліды (4 група здароўя).

На ранішніку таксама прысутнічалі прадстаўнікі кампаніі «Кока-кола». Дзеці атрымалі салодкія падарункі, рэчы першай неабходнасці, сертыфікат на асабістыя патрэбы і зрабілі памятнае фота з гасцямі і навагоднімі героямі.

**Вольга ПРАЛЮК.**



# НА «СКРЫЖАВАННІ» ТАЛЕНТАЎ І МАСТАЦТВАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Забягаючы крыху наперад, адзначу, што многа мерапрыемстваў, запланаваных на наступны год, пройдуць менавіта тут — на пешаходнай вуліцы побач з бронзавым палешуком-гараджанінам. А ў горадзе хутка паявіцца яшчэ адна знакавая культурная кампазіцыя, прысвечаная знакамітым выхадцам з Пінска. Як вядома, першы прэзідэнт Ізраіля Хаім Вейцман, пяты прэм'ер-міністр гэтай краіны Голда Меір сваю першую адукацыю атрымлівалі ў Пінску. Засталася навучальная ўстанова таго часу, якая, дарэчы, і цяпер служыць справе адукацыі. Вось там паўстане помнік знакамітым людзям. Яго адкрыццё плануецца будучым летам, — паведаміла **загадчыца сектара культуры гарвыканкама Тамара ДЗЕМІДЗЕНКА.**

Тамара Іванаўна расказала, што ўсяго на год запланавана 445 мерапрыемстваў, прысвечаных статусу культурнай сталіцы і звязаных з гэтай падзеяй. З іх чатыры дзясяткі адрозніваюцца значным маштабам і вялікай колькасцю ўдзельнікаў. Гэта, напрыклад, фестываль духавых аркестраў, фэст арганнай музыкі, вялікі фестываль мастацтваў «Зоры над Пінай».

Паводле слоў арганізатараў, надаецца асаблівае значэнне масавым мерапрыемствам, напрыклад, такім, як фестываль вулічнай творчасці «Скрыжаванне». Вось на гэтай самай пешаходнай вуліцы Леніна ўсе змогуць паказаць свае таленты. Для ўдзелу ў мерапрыемстве спатрэбіцца ўсяго толькі жаданне і неабходнасць загадзя паведаміць пра свой намер. Як толькі пацяплее, ва ўсе выхадныя дні на гэтым творчым скрыжаванні аматары мастацтваў будуць спяваць, танцаваць, сюды ж прыйдуць мясцовыя паэты, каб пачытаць уласныя вершы, а дэкламатары змогуць пачытаць і класікаў, было б жаданне. Тут жа будуць працаваць і мастакі — кожны ахвотны зможа замовіць ім свой партрэт альбо набыць прыгожы пейзаж. Гэта вуліца, паводле задумкі, мусіць стаць гэткай агульнагарадской культурнай прасторай альбо нават культурным рухам, каб кожны адчуў, што статус культурнай сталіцы гэта не толькі пералік абавязковых мерапрыемстваў, нярэдка афіцыйных, гэта яшчэ і яго справа.



Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Напрыклад, фестываль арганнай музыкі для горада справа не новая. У гарадской канцэртнай зале, якая ўтворана ў касцёле Карла Барамея, выступалі ў розны час Уладзімір Неўдах, Канстанцін Шароў, Кацярына Лявонцьева, Ігар Алоўнікаў, Ксенія Пагарэлая, Элеанора Бялева, Барыс Штокалаў, а таксама цэлы шэраг вядомых замежных музыкантаў. Узведзены ў XVIII стагоддзі ордэнам ксяндзоў-камуністаў кляштарны касцёл і сёння з'яўляецца адной з галоўных славутасцяў горада. Спецыялісты кажуць, што двухметровыя сцены гэтай мініяцюрнай крэпасці здольныя вытрымаць любы шторм. А статус горада яшчэ раз прымушае звярнуць увагу, асабліва моладзі, на цікавую гісторыю будынка, якая сведчыць, што камуністы, прынамсі ў Пінску, з'явіліся задоўга да кастрычніцкіх падзей XX стагоддзя. Пінск слаўны многімі помнікамі даўніны. Сярод іх першы калегіум езуітаў, дзе цяпер размяшчаецца Музей беларускага Палесся, ансамбль былога манастыра францысканцаў, касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі з яго знакамітай «Пінскай мадоннай». Абрысы гэтых славутасцяў склалі лагатып культурнай сталіцы. Гарвыканкам падвёў вынікі конкурсу — перамагла работа Віктара Сагановіча. Белыя лініі на эмблеме паказваюць напрамкі асноўных вуліц горада.

**Старшыня Пінскага гарадскога Савета дэпутатаў Лявонцій ЛЕМЯШЭЎСКІ,** якому выпала ганаровая місія атрымаць эстафету культурнай сталіцы ад папярэдніка-Полацка, адзначыў:

— Статус горада ў 2019 годзе накладвае на ўсіх яго жыхароў пэўныя абавязацельствы. У нас ёсць прафесійны тэатр, вышэйшая навучальная ўстанова, шэраг устаноў культуры. На працягу года яны павінны выканаць пэўныя асветніцкія задачы. У нас ёсць на чым выхоўваць культурныя традыцыі, маю на ўвазе найперш багатую гісторыю больш чым 900-гадовага Пінска, цікавую разнастайную спадчыну. Жывучы ў старажытным прыгожым горадзе, кожны павінен ведаць мінулае, славутасці і клапаціцца аб захаванні прывабнага знешняга выгляду, адным словам, быць вартым памяці продкаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Добрая навіна

# «ЗВЯЗДА» ІДЗЕ Ў ГОСЦІ

**На адзіны дзень інфармавання ў Мажэйкаўскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад — сярэдняя школа, куды мяне запрасілі з мэтай бліжэй пазнаёміць школьнікаў са «Звяздой», я ішла з асаблівым хваляваннем.**

З дзясятак гадоў прайшло пасля выпуску, а ў маёй роднай школе ўжо іншая фарба на сценах, далёка не поўны камплект настаўнікаў, якія праводзілі «ў добры шлях», ды і за партай цяпер іншыя цікаўныя хлопчыкі і дзяўчаткі, якія з імпэтам слухаюць пра газету, дзе я працую. Гартаючы старонкі, знаходзяць нешта цікавае для сябе, не саромеюцца задаваць пытанні — ім так хочацца даведацца, як стваряецца найстарэйшая газета краіны.

Падобныя сустрэчы, якія рэгулярна ладзяцца для вучняў старшых класаў, у Мажэйкаўскай школе сталі традыцыяй. Падчас дыялогу з прадстаўнікамі мясцовай улады, культурнай сферы, масмедыя падрастаючае пакаленне можа задаць пытанні, якія найбольш хвалююць, а адпаведна хоча быць у курсе сітуацыі не толькі на тэрыторыі свайго рэгіёна, а і ўсёй краіны.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Открытое акционерное общество «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ», местонахождение: 220007, г. Минск, ул. Володько, д. 20,** доводит до сведения акционеров и иных заинтересованных лиц о том, что по результатам проведенной эмиссии Департамент по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 19.12.2018 зарегистрировал в Государственном реестре ценных бумаг дополнительный выпуск простых (обыкновенных) акций ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ» в количестве 1 333 330 штук, номинальной стоимостью 0,15 рубля на сумму 199 999,50 рубля.

Всего по состоянию на 19.12.2018 в Государственном реестре ценных бумаг зарегистрированы простые (обыкновенные) акции ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ» в количестве 1 451 379 штук, номинальной стоимостью 0,15 рубля, общая сумма выпуска 217 706,85 рубля.

Управляющий А. Н. Червонец.

УНП 100036332

**ООО «БелИнвестОценка» извещает о проведении повторного открытого аукциона в г. Любани по продаже объектов Филиала № 6 «Любанский КСМ» ОАО «Белорусский цементный завод»**

**Лот № 1:** Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4727, площадью 70,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл. **г. Любань**, ул. Боровика, 44Б-1. Начальная цена продажи – **7 680** рублей, в т. ч. НДС – 1 280 руб.

**Лот № 2:** Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4728, площадью 67,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл. **г. Любань**, ул. Боровика, 44Б-2. Начальная цена продажи – **7 380** рублей, в т. ч. НДС – 1 230 руб.

**Лот № 3:** Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4729, площадью 68,6 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл. **г. Любань**, ул. Боровика, 44Б-3. Начальная цена продажи – **7 440** рублей, в т. ч. НДС – 1 240 руб.

**Лот № 4:** Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4730, площадью 67,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл. **г. Любань**, ул. Боровика, 44Б-4. Начальная цена продажи – **7 260** рублей, в т. ч. НДС – 1 210 руб.

**Лот № 5:** Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4731, площадью 67,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл. **г. Любань**, ул. Боровика, 44Б-5. Начальная цена продажи – **7 320** рублей, в т. ч. НДС – 1 220 руб.

**Лот № 6:** Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4733, площадью 88,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл. **г. Любань**, ул. Боровика, 44Б-7. Начальная цена продажи – **9 540** рублей, в т. ч. НДС – 1 590 руб.

**Лот № 7:** Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4735, площадью 89,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл. **г. Любань**, ул. Боровика, 44Б-8. Начальная цена продажи – **9 660** рублей, в т. ч. НДС – 1 610 руб.

**Лот № 8:** Тепловоз ТГМ-4, № 2435 с инвентарным № 1081922 адресу: Минская обл. Любанский р-н, **Юшковичский с/с, 2/2**. Начальная цена продажи – **59 598** рублей, в т. ч. НДС – 9 933 руб.

Извещения о предыдущих несостоявшихся аукционах по данным лотам было опубликовано в газете «Звязда» от 25.07.2018 г. № 140, от 05.09.2018 г. № 170, от 25.09.2018 г. № 184 и в газете «Голас Любаншчыны» от 16.11.2018 г. № 69.

Аукцион состоится **09.01.2019 г.** в **14.00** по адресу: Минская обл., Любанский р-н, п/о Смольгово (Филиал № 6 «Любанский КСМ»).

***Задаток*** *– 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется Организатору аукциона на р/с № BY29BPSB30121505440129330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBB2. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.*

Заявление на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по 08.01.2019 г. включительно по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 62, оф. 910. Заключительная регистрация участников – 09.01.2019 г. с 12.00 до 13.45 по месту проведения аукциона.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с ОАО «Белорусский цементный завод» не позднее 10 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (017) 398-29-44, 8(029) 615-40-08 e-mail: belinvo@tut.by и на сайте belinvo.by

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Трамп: урад ЗША не пачне работу, пакуль дэмакраты не дадуць грошай на сцяну



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп заявіў, што федэральны ўрад ЗША не адновіць дзейнасць, пакуль дэпутаты-дэмакраты ў Кангрэсе не прагаласуюць за выдзяленне сродкаў на будаўніцтва сцяны на мяжы з Мексікай.

«Я не магу вам сказаць, калі ўрад адновіць работу», — сказаў Трамп. «Я магу сказаць вам, што ён не будзе працаваць да таго часу, пакуль у нас не будзе сцяны, ці агароджы (як бы там яны [дэмакраты] гэта ні называлі), — дадаў прэзідэнт ЗША. — Я буду называць гэта так, як яны хочуць, але гэта будзе адно і тое ж. Гэта — бар'ер ад людзей, якія пранікаюць у краіну, і ад наркотыкаў».

«Калі ў нас не будзе гэтага [сцяны], то не адновім работу», — дадаў Трамп.

Заканадаўцы ЗША дагэтуль не здолелі прыняць бюджэт на 2019 фінансавы год, які ў ЗША пачаўся яшчэ 1 кастрычніка. Абедзве палаты Кангрэса завяршылі свае пасяджэнні, так і не прыняўшы ніякай кампраміснай рэзалюцыі, якая дазволіла б часова пазбегнуць закрыцця федэральных ведамстваў.

## Цэны на нафту наблізіліся да $50 за барэль

Кошт ф'ючарса нафты маркі Brent з пастаўкай у лютым 2019-га апускаўся падчас таргоў на біржы ICE ў Лондане да $50 за барэль, абнаўляючы мінімумы ліпеня — жніўня 2017 года.

21 снежня міністр энергетыкі РФ Аляксандр Новак заявіў журналістам, што падзенне сусветных цэн на нафту ў канцы года «не з'яўляецца паказальным».

Двума днямі раней міністр энергетыкі Саудаўскай Аравіі Халед аль-Фалех таксама заклікаў захоўваць спакой з нагоды цэн на нафту. На яго думку, карэкцыя тлумачыцца тым, што інвестары зараз закрываюць доўгатэрміновыя пазіцыі ў нафце. Саудаўскі міністр таксама выказаў надзею, што пагадненне АПЕК+ па скарачэнні здабычы нафты дапаможа стабілізаваць рынак. Краіны АПЕК+ некалькі дзён таму прынялі пастанову скарацідь здабычу нафты на 1,2 млн бараляў за дзень у першым паўгоддзі 2019 года.

## Міністэрства аховы здароўя Расіі хоча вывесці тытунь з абароту пасля 2050 года



Міністэрства аховы здароўя Расіі падрыхтавала праект канцэпцыі дзяржаўнай палітыкі процідзеяння спажыванню тытуню на 2019—2030 гады, паведамляюць ТАСС і РБК.

Па звестках СМІ, асноўнай мэтай канцэпцыі з'яўляецца паступовае зніжэнне тытунекурэння і магчымы вывад тытунёвай прадукцыі з абароту пасля 2050 года. Як рaзлічвае ведамства, да 2050 года толькі 5 % расіян будуць курыць. Паводле звестак на 2016 год, курылі 30,9 % грамадзян Расіі. Да 2025 года Міністэрства аховы здароўя мае намер знізіць гэты паказчык да 25 %.

«У канцэпцыі гаворыцца пра зніжэнне да 2050 года распаўсюджанасці спажывання тытуню да 5 % сярод насельніцтва і наступны разгляд пытання аб паслядоўным вывядзенні з рынку», — сказаў намеснік міністра аховы здароўя Расіі Алег Салагай.

Раней паведамлялася, што Міністэрства аховы здароўя РФ сумесна з экспертамі прапрацоўвае пытанне ўвядзення «абязлічаных» пачкаў цыгарэт і хоча скараціць колькасць дазволеных месцаў для курэння.

# МАЙСТАР-КЛАС КАЛЯ НАВАГОДНЯЙ ЁЛКІ



Выстаўка «Ёлкі ў фота».

## Тайна снегавіка ў арабінавых каралях

«Снегавік — гэта знанычаць, што ён вылеплены са снегу...» — спяваецца ў адной дзіцячай песеньцы. Але ў нашым выпадку снегавік увасобіўся ў гліне. Керамiст Руслан Сямёнаў думаў спачатку, што яго вучаніца абярэ свінку — яна ж гераіня будучага года. На майстар-клас ён прынёс шмат нарыхтовак сімпатычнай дзюдзі і ўсяго некалькі снегавікоў. Але Ала Галушка нечакана ўзяла ў рукі снегавіка. Кажа, што ў дзяцінстве часта займалася гэтым персанажам.

На стале шмат фарбаў і пэндзляў, майстар падказвае, які выбраць. Задача вучаніцы размаляваць цацку на свой густ. Яна бярэ ў рукі інструмент, і снегавік пачынае «ажываць». Пад прыемную работу надзвычай лёгка ажываюць навагоднія ўспаміны.

— Я сама з Горак, бацька там працаваў выкладчыкам у сельгасакадэміі, — прыгадвае яна сваё дзяцінства. — Калі я была маленькая, мы жылі ў інтэрнаце. Нас усіх гэта агульнае жыллё вельмі яднала. Ніколі не забуду, як мы сустракалі Новы год. Збіраўся цэлы паверх, разам адзначалі, хадзілі адзін да аднаго ў госці цэлую ноч. Мы не вельмі прытрымліваліся нейкіх там традыцый, але ўсё рабілі разам. Нас апраналі ў навагоднія касцюмы, мы выступалі, спявалі, расказвалі вершы. Памятаю, была такая вялікая каробка цукерак, адна з якіх вельмі прыгожая ў яркай фользе. Я вельмі старалася выступіць як мага лепей, каб атрымаць гэтую цукерку.

А яшчэ ў дзяцінстве я хадзіла ў тэатральную студыю, да Новага года мы рыхтавалі казку «Лятучы галандзец», і я іграла там ролю прынцэсы. На прэм'еру сабралiся ўсе мае аднакласнікі. А я была ў кароне, такая прыгожая...

Пад шчырыя гутаркі снегавік непрыкметна «апрануўся» ў белы каптан, і, калі б не майстар, напэўна, пэндзаль з белай фарбай паступова перайшоў бы і на капялюш. Ох ужо гэтыя ўспаміны, так зацягнуць, што пра ўсё забудзешся. Дык на чым мы там прыпыніліся? З чаго пачынаецца Новы год?

— Вядома ж са снегу, з ёлкі. У мяне, праўда, зараз яна штучная, але некалькі жывых галінак абавязкова прысутнічаюць. Стараюся ў кожным пакоі зрабіць навагодні куточак. Нават у ваннай у мяне зімовая кампазіцыя са свечкамі. Вялікія застоллі не рыхтую, але які Новы год без салаты аліўе? Мандарыны, шампанскае і цукеркі таксама павінны быць. Люблю выключыць святло, уключыць ёлку, сесці на канапу і глядзець на агеньчыкі. Вельмі люблю падарункі. У дзяцінстве мы радаваліся цукеркам. А калі там знаходзілі яшчэ і мандарыны, шчасцю не было мяжы. Адкрыю сакрэт: усе падарункі для маіх аднакласнікаў рабіла мая маці. У нас дома збіраліся яе сяброўкі з бацькоўскага камітэта і дапамагалі. Бацька прынёсіў з гаража яблыкі, мы іх мылі, націралі, каб яны блішчалі. Хацелася, каб усе былі задаволеныя. Да Новага года купляліся шкляныя шары, і нават калі яны біліся, іх не выкідвалі. Пряклейвалі ўсё, што засталося ад іх, на вату і рабілі карону...

На каптане снегавіка з'явілася спачатку рабінавыя каралі, потым блакітныя сняжынкі. Майстар ужо нават і не ўмешваецца ў работу сваёй вучаніцы. Ды і навошта, калі яна такая здольная.

— Чароўных дванаццаці гадзін чакалі ўсе, але дацягваў не кожны, — усміхаецца яна, робячы ўжо апошнія штрыхі. — Памятаю, як шмат гасцей было каля нашай навагодняй ёлкі. І дарослым, і дзецям — усім было весела. Хацелася, каб свята доўжылася бясконца. Я і зараз яго чакаю. У мяне нават ёсць свой рэцэпт загадвання жаданняў. Пад бой курантаў трэба напісаць на паперцы сваю мару, спаліць яе і выпіць з шампанскім. Працуе нават, калі занатаваць жаданне ў нататнік. Толькі трэба загадваць яго ў цяперашнім часе. Напрыклад, я падарожнічаю па Іспаніі і сустракаюся з цікавымі людзьмі. І не разменьвайцеся на дробязі...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Дрэўца з гісторыямі ад магіляўчан

Снегавік Алы Галушкі папоўніў эксклюзіўную калекцыю для ёлкі ад магілёўскіх рамеснікаў.

— Першая 12 навагодніх цацак у нас ужо ёсць, — радуецца Ала Смалякова. — Калі рыхтавалі выстаўку, успомнілі, што шмат хто з нас у дзяцінстве рабіў нешта для навагодняй ёлкі сваімі рукамі. Так прыйшла ідэя запрасіць вядомых у горадзе людзей, якія ўнеслі сваю лепту ў яго развіццё, і зрабіць вось такі ўнікальны набор.



**Ала ГАЛУШКА стварыла снегавіка пад кіраўніцтвам Руслана СЯМЁНАВА.**

Удзельнікам давалі магчымасць рэалізавацца з улікам іх прафесій. Напрыклад, хірург Дзмітрый Сарокін, аўтар медзведзяняці, працаваў як і трэба са скурай і ніткамі. Аляксандр Гарадкоў, мастацкі кіраўнік магілёўскіх гарадскіх аркестраў, зрабіў шар у тэхніцы дэкупажу. Дырэктар гарадской бібліятэкі імя Карла Маркса Вольга Волкава змайстравала шыкоўную падвеску. На вочы трапляюць дзве паловы яблыка. Іх нават можна прыняць за старадаўнія цацкі з ваты. Але гэта таксама справа рук удзельнікаў майстар-класаў. Іх аўтары — начальнік упраўлення культуры Магілёўскага гарвыканкама Ірына Жабарава і яе намеснік Марына Клепчукова. Сярод майстроў, якія давалі ўрокі, была і вядомая па сваім сацыяльным праекце «Тэрыторыя людзей» Алеся Цумарава, тая самая, якая дапамагае людзям з абмежаванымі магчымасцямі знайсці сваё прызначэнне ў жыцці. «Звязда» неаднаразова пісала пра гэтую мужную маладую жанчыну. На выстаўцы наогул шмат работ, зробленых рукамі людзей, якіх сабрала вакол сябе Алеся.

— Яшчэ шмат засталося вядомых у горадзе асоб, якіх хацелася б запрасіць у наш праект, — кажа Ала Смалякова. — Налета, магчыма, майстар-класы стануць яшчэ і калектыўнымі.

Акрамя аўтарскай ёлкі на выстаўцы шмат чаго іншага цікавага і незвычайнага. Напрыклад, фотавыстаўка з тварамі вядомых у Магілёве людзей. Ідэю аб'яднання рамеснікаў нечакана дружна падтрымалі і артысты, і дзяржслужачыя, і ўрачы... Вось фота маленькага Андрушы на навагоднім ранішніку — цяпер гэта намеснік старшыні аблвыканкама Андрэй Кунцэвіч. Яшчэ ў адным хлопчыку ў касцюме Арлекіна пазнаю сённяшняга старшыню Камітэта эканомікі Руслана Страхара. Ён з самазабыццём расказвае верш Дзеду Марозу. Сур'ёзны кучаравы малы на банкетцы — гэта вядомы сёння артыст і рэжысёр Магілёўскага драмтэатра Уладзімір Пятровіч. Па суседстве дзіцячыя фота артыстаў тэатра Рыгора Белацаркоўскага, Галіны Лабанок... А вось і Ала Смалякова ўласнай персонай — сціплая дзяўчынка ў касцюме Снягуркі. Шмат дзіцячых фота медыйных асоб — супрацоўнікаў тэлеканала «Беларусь 4. Магілёў» Алесі Рыбалкі, Юрыя Пракапенкі, Мікалая Каманцава... Тут жа дзіцячае фота дырэктара «Магілёўзеленбуда» Пятра Аляксейчыкава, Дзмітрыя Сарокіна ў коле сям'і, ён, дарэчы, хірург у другім пакаленні. Ёсць наогул рарытэтныя фота. Напрыклад, на фоне высачэзнага вершніка на кані каля Дома Саветаў. Калісьці была традыцыя ляпіць там снежныя фігуры.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**6 февраля 2019 года в 10.00 в малом зале Гомельского районного исполнительного комитета, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, состоится аукцион по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков**

| Номер лота | Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, характеристика инженерных коммуникаций, условия предоставления | Начальная цена предмета аукциона*, бел. руб. | Расходы по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению победителем аукциона, и **дополнительно** расходы, связанные с публикацией объявления, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Земельные участки, предоставляемые **в частную собственность для коллективного садоводства** (земельные участки для коллективного садоводства): Гомельская обл., Гомельский район, Поколюбичский сельсовет, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна». Имеется возможность подключения электроснабжения. **Проведение аукциона с условиями** Земельные участки с самовольными капитальными (некапитальными) строениями, подлежащими сносу. Согласно Протоколу поручений рабочей комиссии от 13 сентября 2018 г., а также заявлений, поданных гражданами, в случае неприобретения ими самовольно занятых земельных участков, по результатам аукциона, они обязуются произвести снос капитальных (некапитальных) строений находящихся на земельных участках в течение месяца с момента подписания протокола проведения аукционных торгов за счет собственных средств | | | | |
| 1 | Участок № 94 к/н 321084800019000077, площадь 0,1394 га. Ограничения (обременения) прав на земельный участок на площади 0,1394 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона рек и водоемов) | 8 949,50 | 1 392,10 | 895,00 |
| 2 | Участок № 101 к/н 321084800019000078, площадь 0,1170 га. Ограничения (обременения) прав на земельный участок: 0,1170 га – на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона рек и водоемов); 0,0041 га – в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт); 0,0062 га – в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (в охранных зонах электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт) | 7 511,40 | 1 171,33 | 751,00 |
| 3 | Участок № 85 к/н 321084800019000076, площадь 0,0990 га. Ограничения (обременения) прав на земельный участок на площади 0,0990 га в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона рек и водоемов) | 6 355,80 | 1 095,91 | 636,00 |

Организация, которая предоставляет информацию о месте размещения земельных участков, которые предполагается передать в аренду, частную собственность по результатам аукциона: Управление землеустройства Гомельского районного исполнительного комитета, г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 123, телефон для справок 8 0232 53 15 21.

Условия предоставления земельных участков: в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона обеспечить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него; в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления, по мере изменения фактического состояния и характера использования земель обратиться в райисполком для внесения сведений в государственный земельный кадастр сведений об изменении видов земель.

Задаток вносится на р/с: Гомельского райисполкома BY73AKBB36414140002703100000, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21302, УНП 400178549. Место, дата. время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 123 тел. 53 15 21. Дата и время начала и окончания приема заявлений **3.01.2018 по 4.02.2019 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 16.00.**

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение установленной формы. Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с представителем комиссии по организации и проведению аукционов по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков. Ознакомиться с земельным участком возможно при предварительном согласовании с управлением землеустройства Гомельского райисполкома, позвонив по телефону 53 15 21.

*первоначальная цена предмета аукциона может быть изменена при изменении курса доллара на дату принятия решения.



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, организуемого ККУП «Витебский областной центр маркетинга»**

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 710/С-10661, наименование – жилой дом 92, назначение – жилой дом, площадью 91 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Жуковского, д. 92, расположенное на земельном участке с кадастровым № 741000000008000989. Составные части и принадлежности: две пристройки, сени, четыре сарая, баня, два гаража, уборная. **Нач. цена:** 5 828,76 бел. руб. **Задаток:** 582,88 бел.руб.

**Условия:** 1. Участник аукциона, ставший победителем, единственный участник, который приобрел недвижимое имущество по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов (далее – Победитель аукциона), обязан: оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен соответствующим Управлением Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь, созданного в нем межрайонного отдела, в котором имущество состоит на учете, но не более чем на 20 рабочих дней; возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. 2. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект (Объекты) недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь. 3. На Победителя аукциона распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-14.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **www.marketvit.by**. Для участия в аукционе необходимо подать заявление и подписать соглашение о правах и обязанностях сторон при организации и проведении аукциона с ККУП «Витебский областной центр маркетинга». При оформлении лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет: копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица и его паспорт; паспорт для физических лиц или их представителей, нотариально заверенная доверенность для представителя физического лица; копию платежного документа, подтверждающего внесение в установленном порядке задатка в размере 10 % от начальной цены продажи; организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе; документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на русский или белорусский языки; представителями организаций – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Задаток перечисляется** на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 06.01.2018, 21.02.2018, 01.03.2018, 17.03.2018, 23.05.2018, 07.07.2018, 16.08.2018, 24.11.2018.

**Повторный аукцион состоится 11.01.2019 в 14.15** по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, пл. Ленина, 1, каб. 310 в Бобруйском межрайонном отделе управления по Могилевской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь. **Срок внесения задатков и приема документов:** в рабочие дни с 27.12.2018 с 8.30 по 10.01.2019 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» (каб. № 7). **Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by**

# АПЕРАЦЫЯ «З НОВЫМ ГОДАМ»

Ці ведаеце вы, без чаго немагчымы Новы год? Без ёлкі, салаты аліўе, снегу, мандарынаў? Без тэлевізара — галоўнага ўпрыгажэння навагодняга стала? Ды колькі заўгодна — месцы і абставіны розныя бываюць. Без сапраўднага Дзеда Мароза? Тройчы «ха», у любым дзіцячым садку 99 % жаночага калектыву можа даць майстар-клас, як на 15 хвілін ранішніка ператварыцца ў Дзеда Мароза і не «спаліцца» перад дзецьмі. Ці без падарункаў? Пытанне наўздагон: а калі гэты падарунак — шкарпэткі, то мо лепш без прэзента?

Зусім выпадкова цэнтральную ідэю, калі хочаце, стрыжань любога свята (і асабліва Новага года) давялося пачуць ад дзяцей. «Калі ты будзеш сядзець такая надзьмутая і незадаволеная, то Новы год да цябе не прыйдзе, бо ў цябе няма настрою, ты не гатова яго сустракаць», — строга выгаворвала школьніца, відаць, клас трэці, у калідоры сваёй пакрыўджанай на ўвесь белы свет сяброўцы. Не ведаю, якія аргументы дзяўчынка прыводзіла раней, але гэты — спрацаваў.

«Хіба можа быць запраграмаванае, чаканае, запланаванае шчасце?» — магчыма, запытаеце вы. Дык ніхто і не кажа, што трэба весяліцца прымусова, натужна, — няма нічога больш шкоднага за прыдворную працу і прыклееную ўсмешку, бо «ёсць устаноўка весела сустрэць Новы год». Безумоўна, існуе не адна аб'ектыўная прычына, калі святочнага настрою проста няма і нідзе не возьмеш. Але ўмець знаходзіць радасць і шчасце нават у дробязях, нягледзячы на абставіны, насуперак таму, што пад канец года многія людзі такія агрэсіўныя, — рэдкая і надзвычай карысная для жыцця вартасць. Гэтаму аптымізму вучымся ў тым ліку і мы, журналісты, — у шматлікіх нашых герояў, моцных, светлых, цікавых і добрых людзей, з якімі сустракаемся цягам года і пра якіх расказваем на старонках «Сямейнай». І як паказвае практыка, калі выхаваць Бабу-Ягу ў сваім калектыве, — чытай, жыццялюбства ў сабе, то шмат якія рэчы становяцца працейшымі: і касцюмчык сядзіць як след, і ўсмешка на твары пасуе часцей і ўпрыгожвае цябе так, што люстэрка ўпэўнена падказвае: не прынцэса — каралеўна!, і няважна становіцца, колькі цяпер градусаў ніжэй нуля, і належным чынам спрацоўвае снегаўборачная лапата і тэорыя шасці паціскання рук, праз якія нібыта знаёмы ўсе людзі на зямлі і распаўсюджваецца эстафета добрых учынкаў...

Словам, не цягніце да Новага года, спадзеючыся, што вось — хоп! — і пад бой курантаў, пад «У лесе нарадзілася елачка», любімыя святочныя камедыі і эстрадныя хіты настрой раптам аднекуль з'явіцца і прыжывецца ў арганізме, як родны. Каб свята атрымалася, яго трэба чакаць і да яго трэба рыхтавацца, знешне ды ўнутрана. Каб кожны год 31 снежня — хоць у лазню, хоць у тэатр, хоць па дарозе на Канары, хоць з сябрамі ў лес, хоць дома з сям'ёй, — але галоўнае, каб з задавальненнем. Інакш і пачынаць не варта.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

***P. S.*** А калі вы знайшлі ў тэксце ўсе цытаты і намёкі на навагоднія фільмы — вам плюсік у карму і некалькі балаў у скарбонку святочнага настрою!

**Сямейная газета**

Выпуск № 24 (115)

Тыя, хто побач

# ПАСПЕЦЬ УСЁ І НАВАТ БОЛЬШ

## ДЛЯ ГЭТАГА ШМАТДЗЕТНАЯ МАЦІ ЗМЯНІЛА ЖЫЦЦЁ — СВАЁ І РОДНЫХ



**Вольга ЖАДЗЕЕВА — журналістка, бізнес-вуман, да таго ж маці пяцярых дзяцей. Яна стваральніца першага беларускага партала пра моду PRETAPORTAL, саўладальніца крамы адзення і аксесуараў «Канцэпт-крама». Пра каханне, кар'ерны шлях, сакрэты ўдалага планавання часу і выдатнага мацярынства мы спыталі ў нашай прыгожай суразмоўніцы.**

**— Вольга, якой у юнацтве вам бачылася ідэальная сям'я?**

— З дзяцінства ў галаве была выразная схема асабістага жыцця, дзе абавязкова павінен быць муж і максімум два дзіцяці. У 21 год я сустрэла каханага чалавека, які падчас нашага знаёмства сказаў, што я падобна на яго будучую жонку. Шчырыя пачуцці і жаданне мець дружную сям'ю паўплывалі на тое, што мы пажаніліся ўсяго праз паўгода стасункаў.

**— Зараз у вас пяць цудоўных дзяцей. Знешне яны вельмі падобныя адно да аднаго: блакітнавокія, светленькія. А па характары?**

— Нягледзячы на тое, што нарадзіліся малыя ў адных і тых жа бацькоў, растуць у адной і той жа сям'і, тэмпераменты ў іх розныя. Хоць, напэўна, няправільна казаць пра адных і тых жа бацькоў, бо ў пэўныя перыяды жыцця па ўнутраным адчуванні мы з мужам мяняліся. З кожным годам я і Саша станавіліся больш мудрымі, падрыхтаванымі.

Наша старэйшая дачка Арына, якой зараз 15 гадоў, з чатырох пачала прафесійна займацца фігурным катаннем, цяпер танцуе ў групе падтрымкі хакейнага клуба «Дынама». Калі дзіця «сябруе» са спортам, гэта пакідае свой адбітак на характары: яна баец. І яшчэ мой неаб'ектыўны мацярынскі погляд можа сказаць і аб тым, што Арына вельмі прыгожая і мэтанакіраваная.

Адзінаццацігадовы сын Андрэй — бунтар: заўсёды мае сваё меркаванне, якое гучна адстойвае. Не любіць вучыцца ў школе, але любіць спорт: займаецца дзюдо, футболам. З раніцы да вечара захоплены толькі гэтым.

Дачцэ Магдалене дзевяць гадоў, яна ў нас цікавая асоба: як казачная фея, ласкавая, жывее ў сваім свеце прынцэс і аднарогаў. А яшчэ дзяўчына вельмі высокая для свайго ўзросту, напэўна, будучая мадэль расце!

Стэфаніі шэсць гадоў. Яна, у адрозненне ад Андрэя, цягнецца да вучобы і любіць камандаваць. Ну, і самы маленькі ў сям'і — Мікіта, яму паўтара гадкі. З упэўненасцю магу сказаць, што ён вельмі актыўны і любіць паесці!

**— Чым вы кіраваліся, калі напаўнялі кожную хвіліну вольнага часу сваіх сыноў і дачок дадатковымі заняткамі?**

— Я ўпэўнена, што бацькам трэба займаць дзяцей рознымі актыўнымі дзеяннямі, тлумачыць ім, навошта гэта спатрэбіцца ў жыцці. А яно абавязкова спатрэбіцца. Напрыклад, Арыну мы аддалі на прафесійнае фігурнае катанне, калі ёй было чатыры гады. Штодзённыя трэніроўкі па некалькі гадзін, паралельна — гімнастыка. Часам дачцэ ўвогуле не хацелася ісці, але я заўсёды матывавала, падтрымлівала. Так і з іншымі дзецьмі. Да іх трэба прыслухоўвацца, але не патураць капрызам.

***(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)***

Па душах

# «НЯБЁСЫ» НА ПЛЯЧАХ

## Сучасная казка пра добрых людзей і ажывелыя лялькі



**Не адно пакаленне тэлегледачоў помніць і любіць Аляксандра ЖДАНОВІЧА як Маляваныча з «Калыханкі», нягледзячы на тое, што яго герой ужо некалькі гадоў як не з'яўляецца на экране. Тэатралы добра ведаюць Ждановіча — майстра сцэны, акцёра, цікавага і ў шматлікіх пастаноўках Рускага тэатра, і ў кінаработах. І вельмі нямногія знаёмыя са Ждановічам-дабрачыннікам, стваральнікам інклюзіўных праектаў, мастацкім кіраўніком міжнароднага фестывалю батлеечных і лялечных тэатраў «Нябёсы», што хутка вось ужо пяты раз адбудзецца ў Свята-Елісавецінскім манастыры. Нам падаецца — лік гэтых нямногіх варта павялічыць.**

«Што я, — сціпла адмахваецца Аляксандр Віктаравіч, — мая роля ў фестывалі зусім невялікая, пераважна дзяўчаты трымаюць «Нябёсы» на сваіх кволых плячах, цягнуць усе моманты — арганізацыя, прыём і засяленне замежных удзельнікаў, дабрачынныя акцыі, — хоць некаторым «дзяўчатам» ужо пад шэсцьдзясят».

***(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)***

# «НОРЫ» Ў ФАНТАСТЫЧНЫ СВЕТ,

## або Ці ведаеце вы, што чытаюць вашы дзеці?

**«Дзінка не бачыла твараў і целаў, толькі гэтыя страшныя рукі — нечалавечыя, узгорыстыя, чатырохпальцавыя. Яны выраслі з туману, утыкаліся ў зямлю — усе бліжэй і бліжэй.**
**Не вытрымаўшы, дзяўчына зажмурылася і ў голас закрычала...» (Алека Вольскіх. «Павуцінне старога горада».)**
**Фэнтэзі — адзін з самых папулярных літаратурных кірункаў у сучасных дзяцей. Па падобныя кнігі стаяць у чарзе ў бібліятэках краіны, а асаблівы нецярплівыя трацяць усе свае кішэнныя грошы, каб чаргова раз «праглынуць» твор за два дні.**




— Ведаеце, мяне нават мама аднойчы за гэта адчытала, — са смехам успамінае Каця Пазыніч, трынаццацігадовая жыхарка Мінска. — На дзень нараджэння мне падарылі шмат грошай. І як толькі выдалася магчымасць, я пабегла ў кнігарню і на ўсю суму набыла сабе кніг. Што было, вам не перадаць!

Каця расказвае, што кнігі побач з ёю з самага дзяцінства. Спачатку ёй чыталі бацькі, потым яна — разам з імі, і, канешне, былі перыяд, калі маці трошкі прымушала чытаць... А ў чацвёртым класе сяброўка эмацыянальна прапанавала адну кнігу з серыі «Светашукальнікаў». І ўсё! З таго часу, як прызналася Каця, яе ніхто болей на прымушаў. Яна сама знаходзіць магчымасць чытаць. Спачатку гэта былі серыі кніг фэнтэзі, потым перайшла на класіку і прыгоды. Дарэчы, адной з самых любімых стала трылогія аб мушкецёрах Аляксандра Дзюма.

— Калі чытаю, дык нібыта паглыбляюся ў свет кнігі, як ў нару, — кажа Каця. — Раптам аказваюся цалкам у нейкім нерэальным свеце! Бывае, такая фантастычная бурда, але ўсё роўна адарвацца немагчыма!

І сапраўды, падлеткі з шостага па восьмы клас, якія прыходзяць у бібліятэку па кнігі, аддаюць перавагу фэнтэзі.

— Фэнтэзі чытаюць і дзяўчаткі, і хлопчыкі, — расказвае загадчыца **сектара старэйшага абанемента Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі імя М. Астроўскага ў Мінску Людміла ДУБРОЎСКАЯ.** — Гэта серыі кніг Джаан Роўлінг пра Гары Потэра, серыя «Часадзеі» Наталлі Шчэрбы. Яшчэ вельмі папулярныя кнігі «Таямнічыя прыгоды» Юрыя Сітнікава, Уладзіміра Шломана і Кацярыны Карэтнікавай і жахі для дзяцей Роберта Штайна і Стывена Кінга.

**Вучні 6—8 класаў выбіраюць:**

**Джаан Роўлінг. Серыя кніг «Гары Потэр»;**

**Наталля Шчэрба. Серыя кніг «Часадзеі»;**

**Гір Керсцін. Серыя кніг «Таймлес»;**

**Яўген Глаголеў. Цыкл кніг серыі «Зярцалія», «Пардус»;**

**Серыя жахаў «Таямнічыя прыгоды».**

Сучасныя 9—11-класнікі пераходзяць на класіку. Напрыклад, усе рэкорды ў бібліятэцы пабіў Рэй Брэдберы «Віно з дзьмухаўцоў» і Джэрам Сэлінджэр «Над безданню ў жыце».

— Кантраляваць попыт сённяшніх старшакласнікаў немагчыма, — упэўнена бібліятэкар. — Дзеці ведаюць, што хочуць, і прыходзяць да нас ужо з гатовым спісам. Перачытваюць «Джэйн Эйр», «Птушкі ў цярноўніку», «1984»... Напрыклад, у нас 16 кніг Рэя Брэдберы «Віно з дзьмухаўцоў», але іх амаль ніколі няма, бо сёння малады чалавек здаў, і тут жа іншы забраў.

**Пакаленне Z выбірае:**

**Рэй Брэдберы. «Віно з дзьмухаўцоў»;**

**Джэрам Сэлінджэр. «Над безданню ў жыце»;**

**Харпер Лі. «Забіць перасмешніка»;**

**Джоджа Маес. «Да сустрэчы з табой»;**

**Шарлота Бронтэ. «Джэйн Эйр».**

## РОДНАЯ МОВА З МАЛЕНСТВА

А вось на беларускай мове чытаюць няшмат, сказалі ў бібліятэцы. Нават «Палескіх рабінзонаў» Маўра просяць на рускай. І гэта нягледзячы на тое, што ў некаторых маладзёжных суполках лічыцца крутым чытаць творы на мове арыгінала. Але кнігі на беларускай усе ж заказваюць. У бібліятэцы просяць беларускамоўныя выданні Аляксея Шэіна «Сем камянёў» і Андрэя Жвалеўскага і Яўгеніі Пастэрнак «Гімназія № 13» (дарэчы, падзеі ў рамане адбываюцца ў сучасным Мінску). Таксама сярод беларускамоўных карыстаюцца попытам кнігі Валерыя Гапеева «Мая мілая ведзьма», «Урокі першага кахання» і маладой аўтаркі (пра яе нехалі пісала «Звязда») Ксеніі Шталянковай «Адваротны бок люстра».

А вось на кніжным рынку попыт на кнігі на роднай мове набірае абароты. Пра гэта расказала **памочнік PR-менеджара інтэрнэт-крамы OZ.by Лізавета АРЦУЕВА:**

— У апошні год цікавасць да беларускамоўных кніг значна павялічылася, — гаворыць прадстаўнік кнігарні. — Так, у хатнія бібліятэкі сталі набываць пераклады класічнай сусветнай літаратуры: «Хронікі Нарніі», «Скрозь люстэрка, і што там убачыла Аліса», «Прыгоды барона Мюнхгаўзэна», а таксама кнігі аб прыгодах Пэтсана і Фіндуса. Яшчэ попытам карыстаюцца кнігі Марыі Чарвяковай і Марты Чарновай «Смелая дзяўчынка», Аляксея Якімовіча «Сем гісторый пра Воўка і Вожыка», Міхася Зізюкі «Янка, Шмурдзік, Бухматка ды іншыя» і Ганны Янкуты «Кот Шпрот і таямніца атракцыёнаў», а таксама Уладзіміра Караткевіча, Аляксея Шэіна і Вольгі Гапеевай.

Падобная сітуацыя склалася і ў сектары малодшага абанемента бібліятэкі. Работнікі ўстановы мяркуюць, што дзеці больш ахвотна чытаюць на роднай мове таму, што сучасныя выдавецтвы паклапаціліся, каб кнігі для маленькіх былі яркімі і вельмі прыгожымі.

— У малодшым абанеменце, як і ў старэйшым, карыстаюцца попытам серыі кніг, — гаворыць **загадчыца сектара аддзела абслугоўвання Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі Вольга КРАСІЛЕВІЧ.** — Напрыклад, серыя кніг шведскага пісьменніка і мастака-ілюстратара Свэна Нурдквіста пра старога Пэтсана і яго смешнага коціка ў паласатых штанах Фіндуса. Папулярнасцю карыстаюцца кнігі гэтай серыі як на беларускай, так і на рускай мовах.

Для самых маленькіх мамы выбіраюць кнігі з мінімальнай колькасцю тэксту і вельмі прыгожымі малюнкамі.

— Сёння такія кнігі выдаюць у вялікай колькасці, — расказвае бібліятэкар. — Звычайна да нас прыводзяць дзетак, якія ўжо разумеюць, што такое кніга, і могуць штосьці разглядваць, пакуль маці чытае. Найчасцей для малых бяруць дзіцячую прыгодніцкую літаратуру — як правіла, героямі гэтых кніг з'яўляюцца жывёлы, а ў самім выданні ілюстрацыі размяшчаюцца на ўвесь разварот.

Першакласнікі часта бяруць літаратуру, якую неабходна чытаць па школьнай праграме, з тэкстам, надрукаваным вялікім шрыфтам. Таксама дзеці любяць гісторыі пра дзёрзкую карову маму Му. Серыя створана Юяй Віслandэр і Свэнам Нурдквістам. Прычым любяць гэтыя прыгоды як дашкольнікі, так школьнікі.




Незвычайнай дзеці лічаць серыю пра Мага Захарыю аўтараў Ахіма Альгрыма і Сілке Морытц. Гэта кнігі-загадкі, у якіх трэба знайсці смешныя памылкі: напрыклад, ваду, што «капае» з намаляванага акіяна, ці траву, якая «расце» на стуле.

Сярод папулярных беларускіх аўтараў у малодшым абанеменце — Вольга Гапеева. Яна стварыла маленькія казачныя гісторыі, якія ніхто не пакінуць абыякавым. Героі ў аўтаркі дзіўныя: суп, які не хоча быць нудным, гузік, які шукае сэнс у жыцці, вожык, які ніяк не можа зразумець, чаму людзі перад сном лічаць авечак.

**З малымі і малодшымі школьнікамі можна пачытаць:**

**Томас і Юя Вісландэр. «Мама Му і снегакат»;**

**Свэн Нурдквіст. «Пэтсан і Фіндус святкуюць каляды»;**

**Свэн Нурдквіст. «Каляндар каша»;**

**Зімовы зборнік выдавецтва «Звязда». «Падарунак ад Дзеда Мароза»;**

**Андрэй Жвалеўскі і Яўгенія Пастэрнак. «Праўдзівая гісторыя Дзеда Мароза».**

## СТАНОВЯЦЦА ДАРОСЛЫМІ НЕ РАЗАМ, А ПОБАЧ

Ужо ў трэцім-чацвёртым класах дзяўчаткі і хлопчыкі пачынаюць чытаць усё больш. Школьніцы чытаюць раманы для дзяўчат, хлопчыкі — фантастыку і прыгоды на касмічную тэматыку. Але яны па-ранейшаму любяць, каб героямі кніг былі школьнікі.

Вельмі папулярным праектам тут можна лічыць «Дзённік Нікі» Рэйчал Рэнэ Расэл. Кнігі гэтай аўтаркі любяць не толькі юныя беларусачкі. Дзеннікі ўвайшлі ў топ-10 самых папулярных серый па версіі «Кнігі рэкордаў Гінеса» і заваявалі мноства літаратурных узнагарод. Гэта вельмі трапны і вясёлы дзённік няўдачніцы з цудоўнымі ілюстрацыямі. У кнізе апісаны пытанні, знаёмыя кожнай дзяўчынцы: як паводзіць сябе з хлопчыкам, каб яму падабацца, як будаваць адносіны з бацькамі і сястрой, як завесці сяброў ў класе і потым іх не страціць.

Яшчэ адзін папулярны жанр сярод дзяцей — гэта дэтэктыў. Бадай, самай запатрабаванай можна назваць аўтарку Холі Вэб і яе серыю кніг пра дзяўчынку Мэйзі Хітчынс. Дарэчы, з гэтым згодны і прадстаўнікі названай кніжнай крамы. Кнігі гэтай аўтаркі ўваходзяць у топы продажу ў нашай краіне. Творы апавядаюць пра расследванні разумнай, смелай і цікаўнай дванаццацігадовай дзяўчынкі Мэйзі і яе вернай сабакі Эдзі. Кнігі напісаны ў жанры класічнага англійскага дэтэктыва. Хлопчыкам (хаця і дзяўчаткам таксама) падабаюцца кнігі Ганса Юргена Прэса «Па гарачых слядах. 50 дэтэктыўных загадак» і «Прыгоды «Чорнай рукі». Гэта гісторыі, укладзеныя ў малюнкі для дзяцей, якім не дае спакою слава Шэрлака Холмса і Эркюля Пуаро. Захапляльныя дэтэктыўныя загадкі і рэбусы.

А вось папулярная серыя «Вялікая маленькая дзяўчынка» беларускай аўтаркі Марыі Бяршадскай расказвае пра сямігадовую дзяўчынку і яе сяброў, пра жыццё і турботы звычайных дзяцей.

— Разумееце, серыі кніг — добра не толькі таму, што папулярна, — гаворыць бібліятэкары.— Дзеці, якія палюбілі героя, хочуць знаходзіць яго на старонках зноў і зноў. Гэта не толькі мудры маркетынгавы ход, але і вельмі карысная справа. Праз кнігі дарослыя могуць знаходзіць кантакт з дзецьмі.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга» (продавец)**

**Лот № 1.** Здание общежития, инв. № 500/С-15837. Г. п. – 1960. Площадь – 710 кв. м. Этажность – 2, подвал. Адрес: г. Минск, ул. Гикало, д. 22А. **Начальная цена – 2 000 000,00 бел. руб. без НДС. Задаток – 100 000,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

**Земельный участок:** земельный участок площадью 0,3944 га с кадастровым номером 500000000008001937. Целевое назначение земельного участка: эксплуатация и обслуживание здания общежития № 3. Право постоянного пользования. Описание права, ограничения (обременения) прав: обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ эксплуатирующим организациям – владельцам инженерных коммуникаций, площадь 0,3944 га. Переход права осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**Аукцион состоится 10.01.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.** Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by. Условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (лот № 1), принадлежащего ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга», проводимом 10.01.2019 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 08.01.2019 в 11.00. Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта – Васильев Андрей Алексеевич, тел. 8 (029) 657-16-66. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 24.11.2018

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

**УП «Белконфискат» объявляет о проведении электронных торгов 31.01.2019 г.**

По продаже имущества, зарегистрированного за Луниным Г. Н. Автомобиль «МАЗ 53371», г. в. не определен, дизель, начальной стоимостью 4 480 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 6350326.

УНП 190431606

**УП «Белконфискат» объявляет о проведении электронных торгов 04.02.2019 г.**

По продаже имущества, принадлежащего Козловской Л. А. Легковой седан Toyota Camry, 2012 г. в., бензин, начальной стоимостью 20 900 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНП 190431606

В суд Ельского района Гомельской области поступило заявление о признании умершим Косинского Валерия Сергеевича, 26.01.1967 года рождения, уроженца д. Заречье Овручского района Житомирской области Украины. Последнее известное место жительства – Российская Федерация.

Просьба к гражданам, располагающими какими-либо сведениями о Косинском В. С., сообщить их суду Ельского района Гомельской области в течение двух месяцев со дня опубликования объявления.

# ПАСПЕЦЬ УСЁ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

**— Якая вы матуля?**

— Дзеці кажуць, што я вельмі добрая мама. *(Усміхаецца.)* Але люблю быць паслядоўнай, бо разумею каштоўнасць свайго часу. Мае сілы, энергія патрэбны як для сям'і, так і для працы. Таму часам даручаю малым хатнія клопаты — яны ўсё выконваюць. Ведаюць, што калі чагосьці не зробяць, пакрыўджуся.

**— А хто выконвае хатнія абавязкі, падтрымлівае чысціню ў доме?**

— Ён у нас вялікі. Мыю, прыбіраю, гатую ў асноўным сама, але з нядаўняга часу ў нас з'явілася памочніца па доме, якая прыходзіць раз на тыдзень і прыбіраецца. Шчыра кажучы, гэтага хапае ненадоўга: у прасторы, дзе ёсць маленькія дзеці, парадак доўга не захоўваецца. Што датычыцца трэніровак, секцый, гурткоў, паездак па бальніцах (а гэта велізарны пласт работы), мы з мужам усё робім самі. Часам дапамагаюць дзядулі і бабулі, на шчасце, яны жывуць у Мінску.

**— Вы выхоўваеце дзяцей, аглядваючыся на вопыт сваіх бацькоў, або абапіраецеся на ўласны?**

— Так, часам лаўлю сябе на думцы, што некаторыя фразы, дзеянні раблю так, як мая мама. Але нельга ігнараваць тое, што цяпер іншы час, іншыя магчымасці, а значыць, іншыя метады выхавання. Напрыклад, мне ў маім дзяцінстве было забаронена глядзець тэлевізар, з-за гэтага я да 18 гадоў не бачыла савецкага кіно, нават самых вядомых кінакарцін. Затое вырасла начытаным чалавекам. А мае дзеці кожны дзень сядзяць у гаджэтах на фоне ўключанага тэлевізара. Я разумею, што забараняць ім карыстацца гэтымі магчымасцямі няма сэнсу, бо яны быццам нарадзіліся з уключанай функцыяй «гугліць, лайкаць, падпісвацца».

**— Як мяняўся светапогляд з нараджэннем кожнага дзіцяці?**

— Узрастала разуменне многіх рэчаў. Дзеці вучаць цярпенню: пакуль мы выхоўваем іх, яны выхоўваюць нас. Раней я была больш запальчывай, нервавалася без прычыны, цяпер гэта знікла. Малыя вучаць шанаваць простыя рэчы: яны па-асабліваму радуюцца першаму снегу або паходу ў лес. Да таго ж з часам дарослыя становяцца менш дапытлівымі, і дзеці ім з гэтым дапамагаюць, як ніхто іншы: расказваюць пра новыя модныя плыні, папулярныя кнігі, вядомых блогераў.

Калі б у мяне не было Арыны, Андрэя, Магдалены, Стэфаніі і Мікіты, думаю, маё жыццё было б такім жа насычаным, як зараз: шмат падарожжаў, цікавых сустрэч, але я б дакладна не шанавала... сон, напрыклад. Або магчымасць паесці ў адзіноце, калі ніхто не лезе рукамі ў талерку. *(Усміхаецца.)*



**— У вас ідэальная фігура! Як хутка прыходзілі ў патрэбную форму пасля цяжарнасцяў?**

— Дзякуй за камплімент. Быць у форме — не праблема. Магчыма, вялікую ролю іграюць гены і стыль жыцця. Дазваляю сабе розныя прысмакі, бо разумею, што тая энергія, якую я выдаткоўваю кожны дзень, нашмат большая, чым тая, якую атрымліваю. Першыя месяцы пасля родаў я не ставіла сабе звышмэты хутка прыйсці ў форму. Давала арганізму час на адпачынак, самааднаўленне. Чым старэйшай станавілася, тым больш разумела важныя рэчы: напрыклад, каб захаваць груднае малако, трэба добра харчавацца, не сядзець на дыетах.

**— Заўважыла, што вялікую ўвагу вы аддаяце вонкаваму выгляду. Як сфарміраваўся ваш стыль?**

— Пэўны ўплыў у гэтым аказала мама, нават у нялёгкі час дэфіцыту тавараў і фінансавых цяжкасцяў яна намагалася добра выглядаць і прыбіраць мяне: шыла, вязала, нешта прыдумляла.



**— Вольга, як вы ўспрымалі час дэкрэтаў? Хацелася хутчэй збегчы на працу?**

— Калі ў нас з мужам з'явілася старэйшая дачка Арына, я толькі скончыла ўніверсітэт. Першы дэкрэт я адседзела амаль увесь належны тэрмін — два з паловай гады, і аддавала сябе толькі сям'і. У наступных ужо сумавала, хацелася рэалізавацца. Здавалася, што дарэмна марную час, цяпер разумею, што разважала няправільна. Час знаходжання з малым дзіцем для жанчыны вельмі важны, прадукцыйны, ён дапамагае разабрацца з сабой, зразумець, чаго ты хочаш ад жыцця, усвядоміць жаночую сутнасць.

Цікава, што пасля нараджэння першынца я ставіла перад сабой мэту адразу нарадзіць дваіх, каб не страчваць час без працы. А працавала я журналістам у інфармацыйным агенцтве і для таго, каб знаходзіцца ўвесь час «на хвалі», павінна была мець кантакты, сувязі, сустрэчы. Маё жаданне ажыццявілася — за другі дэкрэт нарадзіла Андрэя і Магдалену. Апошнія два дэкрэты ў мяне былі прадукцыйнымі: з чацвёртым дзіцем стартаваў праект аб модзе PRETAPORTAL, а калі нарадзіла самага маленькага Мікіту, я ўжо займалася «Канцэпт-крамай», паралельна выкладала дысцыпліну «Фэшн-журналістыка» на факультэце журналістыкі БДУ.

**— Звернемся да PRETAPORTAL. Першы ў Беларусі партал пра моду быў створаны ў 2012 годзе. Чаму інтэрнэт-рэсурс, а не папяровае выданне?**

— Таму што блог можна зрабіць любому чалавеку з адносна невялікімі ўкладаннямі. На той момант, калі стварала PRETAPORTAL, у Беларусі не было вялікай разнастайнасці выданняў аб модзе, хацелася ажыццявіць тое, што будзе адпавядаць маім жаданням. Спачатку на сайт пісала толькі я, ужо пасля знайшла добрую каманду, з якой працую і дагэтуль. А да таго часу вяла розныя калонкі ў папяровых выданнях аб модзе, але разумела, што гэтага мала, — адзін тэкст у тыдзень. На сваім жа партале можна пісаць колькі заўгодна.

Увогуле, захапляцца моднай тэматыкай я пачала тады, калі ў мяне ўжо было трое дзяцей. Пісала пра ўсё, што мяне цікавіла, і метадам спроб і памылак зразумела, што добра атрымліваецца развівацца менавіта ў гэтым напрамку. Некаторым людзям здаецца, што мода — вузкая сфера, але гэта не так. Гэта паўнавартасны кірунак у журналістыцы. Калі не валодаеш патрэбнымі ведамі, уласнай пазіцыяй, то меркаванні і артыкулы будуць павярхоўнымі.

**— Зацікаўленасць фэшнсферай у Беларусі пяць гадоў таму і зараз: развіццё ёсць?**

— Безумоўна. Кожныя некалькі месяцаў у краіне з'яўляюцца новыя дызайнеры, гэта я бачу па тым, як яны прыходзяць да нас у «Канцэпт-краму» і хочуць узаемадзейнічаць. «Канцэпт-крама» — гэта пляцоўка, дзе праводзяцца сустрэчы з аўдыторыяй, майстар-класы, прэзентацыі новых калекцый і іменаў. Радуе, што гэта запатрабавана. А яшчэ прыемна, што мужчыны сталі нашмат больш цікавіцца модай. Па статыстыцы нашага партала, іх наяўнасць чатыры гады таму складала каля 6 %, цяпер — 40 %. Самы папулярны артыкул за мінулы год — падборка мужчынскіх вобразаў на пэўны сезон.

**— Калі вы былі студэнткай і вучыліся на факультэце журналістыкі БДУ, таксама вылучаліся сярод іншых працалюбствам, як зараз?**

— Працы я ніколі не баялася, энергіі было шмат, таму хацела паспрабаваць сябе ў розных сферах. Спачатку займалася мадэлінгам, супрацоўнічала з вядомым мадэльным агенцтвам, нават удзельнічала ў буйным конкурсе прыгажосці «Топ-мадэль» Беларусі (а калі ўжо нарадзіла чатырох дзяцей — у «Місіс Беларусь — 2014»). Дзякуючы гэтаму былі і паказы, і кішэнныя грошы. Таксама ўзаемадзейнічала з рэкламнымі акцыямі — піярыла ў той час вядомыя прадукты. Памятаю, як падчас кастынгаў журы глядзелі не толькі на знешнасць, а і на камунікатыўныя навыкі, на стрэсаўстойлівасць. Ужо на апошніх курсах вучобы ва ўніверсітэце працавала сакратаром, паралельна супрацоўнічала з рознымі перыядычнымі выданнямі. Але праз некаторы час дакладна для сябе вызначыла, што журналістыка — у прыярытэце.

**«Дзеці вучаць цярпенню: пакуль мы выхоўваем іх, яны выхоўваюць нас».**

**— Сям'я, журналістыка, бізнес... Як усё паспяваеце?**

— У мяне не фіксаваная праца «з дзевяці раніцы да шасці вечара», яна аддаленая. З нашай сям'ёй мы жывём за горадам, на нейкія сустрэчы, мерапрыемствы выязджаю ў горад, займаюся важнымі справамі. Калі заканчвала ўніверсітэт, у галаве было: «Працаваць — значыць сядзець у офісе, выконваць даручэнні кіраўніцтва». А цяпер разумею, што рабіць гэта можна ў любым месцы: у машыне, у кавярні, дома.

Але магу сказаць, што да такога ўсведамлення прыйшла не адразу. На пачатку мацярынства я ўставала ў пяць гадзін раніцы, гатавала, збірала дзяцей, збіралася сама, адвозіла іх па напрамках, спяшалася на планёрку. А ўвечары ўсіх забірала, рабіла з дзецьмі ўрокі. У хуткім часе адчула эмацыянальнае выгаранне. Ператварылася ў чалавека-функцыю, таму вырашыла змяніць жыццё так, каб было добра і мне, і маім родным. Зараз мой унутраны стан знаходзіцца ў гармоніі, адчуваю сябе шчаслівай.

**Дар'я ШЛАПАКОВА, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «СПЕЦРЕМОНТ», 220036, г. Минск, Бетонный проезд, 13 |

**Предмет аукциона – оборудование, транспорт, спецтехника, расположенная по адресу: г. Минск, Бетонный проезд, 11**

| Лот п/п | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска/дата принятия к бух. учету | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 27802 | Вращающийся лазер PR 25IF | 2400,00 | 120,00 |
| 2 | 21653 | Денситометр индикаторного типа ДНС (по маркировке на изделии ДНС-2) | 516,00 | 25,80 |
| 3 | 21529 | Дефектоскоп магнитопорошковый ПМД-70 | 2160,00 | 108,00 |
| 4 | 21528 | Дефектоскоп магнитопорошковый ПМД-70 | 2160,00 | 108,00 |
| 5 | 21524 | Дефектоскоп у/з УД4 Т | 3240,00 | 162,00 |
| 6 | 21527 | Дефектоскоп у/з УД4 Т | 3240,00 | 162,00 |
| 7 | 153 | Дефектоскоп ультразвуковой CTS-9006 | 8400,00 | 420,00 |
| 8 | 21799 | Дистанционный лазерный измеритель PD-42 | 720,00 | 36,00 |
| 9 | 21702 | Дозиметр рентгеновского и гамма-излуч. ДКС-АТ1121 | 3600,00 | 180,00 |
| 10 | 21635 | Камера сушильная КС 0,25/5,0-400 | 1680,00 | 84,00 |
| 11 | 21531 | Нутромер НМ-4000 | 1200,00 | 60,00 |
| 12 | 21530 | Нутромер НМ-2500 | 588,00 | 29,40 |
| 13 | 21516 | Пила маятниковая (по технической документации станок ПМ-400) | 348,00 | 17,40 |
| 14 | 128 | Прибор ТКА-ПКМ | 240,00 | 12,00 |
| 15 | 21636 | Рентгеновский аппарат Ратмир 190П | 2160,00 | 108,00 |
| 16 | 146 | Сварочный аппарат JASIK ARC 350 | 672,00 | 33,60 |
| 17 | 145 | Сварочный аппарат JASIK ARC 350 | 672,00 | 33,60 |
| 18 | 15001 | Станок вертикально-сверлильный 2Б125 | 864,00 | 43,20 |
| 19 | 21388 | Станок круглопильный, многопильный ЦМ-80 | 3840,00 | 192,00 |
| 20 | 5031 | Станок модельный ЗТ-634 | 1200,00 | 60,00 |
| 21 | 5064 | Станок МП9-1695 | 3480,00 | 174,00 |
| 22 | 21373 | Станок ножовочно-отрезной 872Н | 408,00 | 20,40 |
| 23 | 21389 | Станок унив.»Мастер-Универсал» КЛ-93 | 216,00 | 10,80 |
| 24 | 21390 | Станок универсальный КСМ-180 | 1680,00 | 84,00 |
| 25 | 21375 | Станок фрезерный 675П | 3720,00 | 186,00 |
| 26 | 21391 | Станок фрезерный ИФ-1 | 228,00 | 11,40 |
| 27 | 21478 | Твердомер динамический ТЭМП-2 | 156,00 | 7,80 |
| 28 | 21378 | Токарно-винторезный станок 1М61П | 3960,00 | 198,00 |
| 29 | 21525 | Толщиномер ультразвуковой ТУЗ-2 | 348,00 | 17,40 |
| 30 | 21526 | Толщиномер ультразвуковой ТУЗ-2 | 348,00 | 17,40 |
| 31 | 139 | Толщиномер ультразвуковой ТУЗ-5 | 240,00 | 12,00 |
| 32 | 21479 | Толщиномер ультразвуковой «Булат-1S» | 216,00 | 10,80 |
| 33 | 165 | Толщиномер ультразвуковой CTS-30 B | 936,00 | 46,80 |
| 34 | 21652 | Шкаф сушильный для р/пленки ШСРП | 960,00 | 48,00 |
| 35 | 21523 | Эндоскоп гибкий ЭТГ-10-2.7 | 3240,00 | 162,00 |
| 36 | 21701 | Машина сверлильная МС-50 | 1440,00 | 72,00 |
| 37 | 21762 | Агрегат сварочный TS300SC/EL400T23OMX3DEV с тележкой СТМ300 | 12600,00 | 630,00 |
| 38 | | Автомобиль грузовой бортовой MAZ 437030, год выпуска – 2007 г., рег. номер АМ 2033-7 | 9679,20 | 483,96 |
| 39 | | Автомобиль грузовой бортовой, МАЗ 533603-220, год выпуска – 2007 г., рег. номер АВ 0450-7 | 8995,20 | 449,76 |
| 40 | | Автомобиль грузовой МАЗ 544008 060-031, седельный тягач, год выпуска – 2008 г., рег. номер АК 3216-7 | 16116,00 | 805,80 |
| 41 | | Автомобиль GAZ-2705, грузопассажирский вагон, год выпуска – 2011 г., рег. номер АК 6489-7 | 10248,00 | 512,40 |
| 42 | | Автомобиль ГАЗ 2752, грузопассажирский вагон, год выпуска – 2006 г., рег. номер АА 6140-7 | 3675,60 | 183,78 |
| 43 | | Автомобиль ГАЗ 2752, грузопассажирский вагон, год выпуска – 2006 г., рег. номер АА 9651-7 | 3675,60 | 183,78 |
| 44 | | Автомобиль GAZ-2705, грузопассажирский вагон, год выпуска – 2010 г., рег. номер АК 2060-7 | 9481,20 | 474,06 |
| 45 | | Автомобиль грузовой GAZ-33023, бортовой тентованный, год выпуска – 2010 г., рег. номер АК 2062-7 | 8278,80 | 413,94 |
| 46 | | Автобус вагон GAZ-22171, год выпуска – 2001 г., рег. номер АК 3962-7 | 3385,20 | 169,26 |
| 47 | | Грузовой пикап UAZ 23632-136, рег. номер АН 3291-7 | 10800,00 | 540,00 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Рудович Виктор Андреевич, тел. 8 029 647-94-47

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **30.01.2019** в 11.00 по адресу**: г. Минск, Бетонный проезд, 11, ОАО «СПЕЦРЕМОНТ»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **28.01.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

Мамін дзённік

# НАЙЛЕПШЫ СЯБАР — ДЗЕД

Нядаўна мой Арцёмка ўпершыню ўбачыў снег. Я страсала з пухнатых яловых лапак белыя аблачынкі, што схавалі іх ад маразоў, гэтым самым ствараючы ў яго перад носам «снегапад», а малы хоць бы ўсміхнуўся! Іншая рэакцыя, напэўна, была б, калі б я потым пасадзіла яго не ў каляску, з якой мала што відаць, а ў санкі. Яны ўжо стаяць гатовенькія — Дзед Мароз (а дакладней, бабуля з дзядулем) паклапаціўся загадзя. Дзед Ваня нават нейкую скрыню змайстраваў, каб малы на першым часе з іх не вываліўся. Толькі я абарвала ўсе планы — у калясцы ж цяплей!

Сёлета думалі-гадалі: ставіць ёлку ці не. Цёмік актыўна поўзае, усюды суне свой маленькі дапытлівы носік. Аднаго не пакінеш: то лбом аб секцыю ляснецца, то не разлічыць сілы, каракскаючыся на канапу. Пакутуе ад малога шкодніка і бабулін спацыфілум, які ўжо трывала прапісаўся на падлозе ў гасцёўні. Таму, упрыгожваючы ёлку, на ніжнія галінкі вешала альбо пласмасавыя цацкі, альбо тыя, якіх меней шкада. Была ўпэўнена: ярка-сінія агеньчыкі гірлянды, што зіхацяць ажно ў шасці хуткасных рэжымах, «прывяжуць» малога да лясной прыгажуні. Толькі спацыфілум аказаўся па-за канкурэнцыяй: бабуля пакуль не ведае, што яе любімы вазон ужо палысеў на некалькі лісточкаў. Праўда, праз некалькі дзён ужо і ёлка (добра, што невялікая) была дагары нагамі — на шчасце, увесь удар прыйшоўся на мяне.

У такім узросце прыярытэты ў дзяцей хутка мяняюцца. Цяпер Цёміка не адарваць ад вялікай машыны-самазвала, якую яму падарылі гуляць на перспектыву. Толькі ён знайшоў машынцы іншае прымяненне. Сядзіць у кузаве, важна задраўшы галаву, а дзед яго возіць па трохпакаёвай кватэры.

Дзед Ваня — найлепшы Арцёмкаў сябар. Малы не паспее прачнуцца, а ён тут як тут. Я спакойна прываджу сябе пасля сну ў парадак, гатую сыночку сняданак (жыла б адна — відаць, прывязвала б да сябе). Варта нам толькі кудысьці з'ехаць — дзед ужо сумуе, не ведае, чым сябе заняць (ужо на пенсіі). Мама кажа, што ніколі не падумала б, што мой бацька будзе так вазіцца з унукам.

За гэтыя сем месяцаў дзед памаладзеў гадоў на дваццаць. Быццам і спіна не баліць: поўзае з малым наперагонкі, возіць на машыне, люляе, падкідвае над галавой. Нават курыць кінуў, каб унучку не смярдзела. Такім чынам, стрымаў абяцанне, што будзе дапамагаць гадаваць унука, толькі б мецць яго. Ва ўсіх суседзяў, сясцёр, маўляў, ёсць забава, а «я і памру, відаць, так і не дачакаўшыся нашчадка». Мара збылася! З якім ён імпэтам цягнуў каляску па мінскім парку, калі гэтыя мужчынкі ўпершыню сустрэліся, — ледзь дагналі.

Людзі кажуць, што ўнукаў чамусьці любяць больш, чым дзяцей. Наўрад ці гэта праўда. Проста на сваіх дзяцей (асабліва мужчынам, якія ўвесь час зарабляюць грошы) звычайна часу не хапае, а вось на пенсіі можна і рэабілітавацца. Да канца аддаць тую любоў, якую не аддаў сваім дзецям. А яны, у сваю чаргу, яе атрымліваюць сёння, любуючыся бацькам і сынам, якія ўжо пачалі свой ранішні аб'езд на машыне.

**Вераніка КАНЮТА.**

Святочныя традыцыі

# ЧАС ЦУДАЎ

**Новы год — свята, якое ва ўсіх без выключэння выклікае настальгію. Прадстаўнікі розных пакаленняў расказалі, якія традыцыі святкавання Новага года запомніліся ім з дзяцінства.**

## 50-я: баль-маскарад, факстрот, вінегрэт

**Лунінчанка Наталля КАЗАНКОВА** трымае ў руках томік з чэхаўскімі апавяданнямі. На вокладцы пазначаны год выдання — 1954-ы, а на форзацы каліграфічны запіс, зроблены рукой дырэктара: «Першая прэмія за найлепшы касцюм на навагоднім вечары 1955 г. Валынец Н., вуч. 7 «Б» класа».

— Дэбютны «выхад у свет» я чакала не менш, чым Наташа Растова з «Вайны і міру». Школьны баль-маскарад быў галоўнай гарадской падзеяй на Новы год. Удзел у ім маглі браць толькі старшакласнікі, — прыгадвае Наталля Іванаўна.

І ўсё ж першыя навагоднія ўспаміны жанчыны звязаныя з пасляваенным часам.

— Маці казала нам з братам: «Будзеце добра сябе паводзіць — Дзед Мароз прынясе ёлку». Святочнай ноччу, калі мы засыналі, бацькі ціхенька ўносілі ў хату дрэва і ўпрыгожвалі яго. Мама-рукадзельніца з імпэтам майстравала цацкі сваімі рукамі. Са старых польскіх часопісаў выразала прыгожыя тварыкі, а з тканіны і ваты рабіла «цельцы» балерын, прынцэс і казачных герояў. На калючыя галінкі вешалі таксама маленькія яблычкі, цукеркі, пячэнне, пасыпанае цукрам, самаробныя гірлянды — арэхі, загорнутыя ў фольгу. Увенчвала гэта ўсё непаўторная бліскучая зорка, якую прыдумаў і сканструяваў мой дзядзька — настаўнік чарчэння. Раніцай мы, босыя, убягалі ў пакой і не маглі наглядзецца на зялёную прыгажуню! У паветры вітала непаўторнае адчуванне шчасця з водарам хвоі. Праўда, аднойчы бацькоўскі сюрпрыз не атрымаўся. Будучы школьніцай, я дачакалася запаветнай ночы і сустрэла маму з татам на парозе, калі яны цягнулі ў дом дрэва: «Ага! Вось які Дзед Мароз нам ёлку прыносіць!» Мама тады, здаецца, расстроілася больш за мяне.

Перадсвяточнымі снежаньскімі вечарамі ў кампаніі сяброўак Наталлі Іванаўны была традыцыя: збірацца ў кожнай па чарзе на салодкі стол. Бацькі гатавалі прысмакі, а дзяўчаты ладзілі дамашнія канцэрты.

— А навагоднюю ноч мы праводзілі... у школе! Пачыналася ўсё ў дзевяць вечара і працягвалася да гадзіны-другой. Ніякіх закусак ці шампанскага не было і ў паміне, — расказвае лунінчанка. — Затое танцы былі абавязкова парамі — танга, вальс, факстрот... Не ўмееш? Будзеш стаяць увесь вечар каля сценкі. А кожны з нас хацеў адчуць сябе казачным героем у гэтую ноч. Вядома, вадзілі і карагоды, гулялі ў ручаёк. На працягу вечара працавала святочная пошта.

У дванаццаць гадзін музыка сціхала і зала замірала. З хваляваннем мы слухалі па радыё бой курантаў і зварот-віншаванне да ўсяго савецкага народа. Пасля слова брала дырэктар школы. Яна заўсёды казала нешта пранікнёнае, шмат чаго жадала і шчыра дзякавала. Я і цяпер з асаблівай цеплынёй успамінаю гэтыя словы. Пасля афіцыйнай часткі пачыналася касцюміраванае шэсце вакол ёлкі. Строгае журы ацэньвала не толькі касцюм, але і яго падачу.

Мама Наталлі Іванаўны мела надзвычай тонкі густ і залатыя рукі.

— Я кружылася вакол святочнай ёлкі ў вобразах Чырвонай Шапачкі, Царэўны-Жабкі, Папялушкі, Вольгі Ларынай. Адны толькі маскі з карункаў да касцюмаў былі сапраўднымі творамі мастацтва!

Пасля балю ўсе прыходзілі дадому стомленыя і адразу ж клаліся спаць. Сямейным святам у Лунінцы ў 50-х заставалася Раство. У царкву не хадзілі, але збіраліся на вячэру 6 студзеня пасля ўзыходу першай зоркі. «12 страў, сярод якіх куцця, мой любімы вінегрэт, бульбяныя катлеты пад неверагодным соусам з сушаных грыбоў», – ажыўляе ў памяці смачныя ўспаміны жанчына.



Наталля КАЗАНКОВА ў вобразе Вольгі Ларынай.

— Зараз многія лунінчане не ўяўляюць сабе Новы год без ёлкі на плошчы Леніна ў цэнтры горада. Але да сярэдзіны 50-х на гэтым месцы быў базар. Ёлку ставілі на перакрыжаванні вуліц 17 Верасня і Чырвонай. Дом маёй сяброўкі Алы быў якраз насупраць. Яна звычайна дыхала на заінелае акно, каб шкло адтаяла і можна было любавацца бліскучым хараством у цемры.

## 70-я: паштоўкі, снежныя забавы, «даёдванне»

**Мінчанка Кацярына ВЕРАВА** правяла сваё дзяцінства ў раёне Нямігі.

— Зімы тады былі па-сапраўднаму снежныя і марозныя. Белы, іскрысты Мінск так і заманьваў выйсці на вуліцу. Разам з бацькам мы каталіся з горак насупраць Траецкага прадмесця, качаліся ў гурбах снегу каля Палаца спорту. Ніякіх кірмашоў з шашлыкамі і канцэртаў самадзейнасці там не было. Мы атрымлівалі асалоду ад простых рэчаў, — дзеліцца жанчына. — Пад ёлку мама клала «кулёк» — хрусткі цэлафанавы пакет, забіты цукеркамі. Бацькі на працы таксама атрымлівалі салодкія прэзенты ад прафкама. Праўда, яны на дзве трэці складаліся з ледзянцоў. Маці ж падыходзіла да адбору з густам і размахам: яшчэ з кастрычніка пачынала хадзіць па крамах у пошуках шакаладнага дэфіцыту — суфле, грыльяжу, «Мішак на Поўначы». Самае смешнае, што кожны з дзяцей у сям'і імкнуўся хутчэй з'есці свае цукерачныя запасы. Інакш прыйшлося б дзяліцца імі з астатнімі.

Другі абавязковы пункт перадсвяточнай праграмы — адпраўленне паштовак сваякам па ўсім СССР.

— У маміным спісе было не менш за паўсотні чалавек: браты, сёстры, пляменнікі. Для кожнай сям'і прыдумваўся арыгінальны тэкст віншавання. Паштоўкі, дарэчы, таксама закупляліся яшчэ з восені. У адказ, вядома, навагоднія весткі прыходзілі пачкамі. Шкада, але папяровая спадчына не захавалася: нешта загубілі пры пераездах, штосьці пайшло на дзіцячыя аплікацыі ў школу.

Бацькі Кацярыны Іванаўны былі з ваеннага пакалення, памяталі пра страшны голад. Калі з'явілася магчымасць накрываць багатыя сталы, яны карысталіся ёй па поўнай.

— Ежы заўсёды гатавалі настолькі многа, што даядаць прыходзілася яшчэ доўга. У нас нават паняцце такое было — «даёдванне». Прычым рабілі гэта ўсёй вялікай сям'ёй: 1-га збіраліся на вячэры ў адной мамінай сястры, 2-га — у іншай, 3-га ішлі да бацькавай радні.

Тэлевізар у сям'і Кацярыны Іванаўны з'явіўся яшчэ ў 60-х. Дзеці і дарослыя з задавальненнем глядзелі «Блакітны агеньчык». На думку жанчыны, сэнсу і душэўнасці ў іх было куды больш, чым цяпер. Адчуванне, што Новы год — вяха: «Пакуль на экране падводзіліся вынікі, ацэньваліся поспехі, строіліся планы для ўсёй краіны, мы рабілі тое ж самае, толькі ў сямейнай перспектыве».

— Самы вясёлы і бесшабашны Новы год у маёй біяграфіі здарыўся на другім курсе ўніверсітэта ўзімку 1978-га. Амаль усёй групай мы сабраліся на чатырохпакаёвай кватэры ў самым цэнтры горада. Каб свята не ператварылася ў звычайную «аб'ядалаўку-выпівалаўку», вырашылі зладзіць гумарыстычнае касцюміраванае прадстаўленне. Загадзя быў прапісаны сцэнарый. Мне выпала самая ганаровая роля — Дзеда Мароза. Вядома, адмысловага касцюма ў той час было не дастаць. У ход пайшло маё новенькае, на заказ пашытае паліто — у яго была шыкоўная ярка-чырвоная падкладка з шоўку. Бараду рабілі з сапраўднай ваты, што прадавалася ў аптэцы. Ідэя з пераапрананнямі дзяўчыны ў мужчыну і наадварот была тады надзвычай арыгінальнай. Таму і Снягуркай стаў галоўны ў кампаніі балака-гумарыст.

## 90-я: вёска, трансформеры, мандарыны

— Насуперак стэрэатыпам мы ў той час не галадалі. Навагоднія сталы былі накрытыя смачна і сытна. Дзед Мароз заўжды прыносіў падарункі. З іншага боку, цудоўна памятаю, як з бацькамі хадзіў перад Новым годам «па палучку». Справа ў тым, што ў вялізных чэргах наперад прапускалі людзей з дзецьмі. Але ўсе роўна даводзілася стаяць па 1,5—2 гадзіны ў чаканні, — прыгадвае **гамяльчанін Уладзімір САВАЧКІН.**

Была ў сям'і хлопца традыцыя — 31 снежня іх з сястрой везлі ў госці да бабулі ў вёску. Бацькі прыдумалі легенду: быццам калі нехта ў доме ёсць, то Дзед Мароз саромеецца прыходзіць. Таму, ад'язджаючы, абавязкова пакідалі адчыненай фортку — «павінен жа быў Дзед Мароз неяк у кватэру трапіць».

— Ідэя выдатная. Замест таго каб нудзіцца ў гарадской кватэры, мы цэлы дзень праводзілі на свежым паветры. У хату было не загнаць: каталіся на санках, гулялі з вясковымі ў сняжкі і ляпілі снежных баб. У гэты час маці з бабуляй маглі спакойна гатаваць святочную вячэру. Праўда, клопату дадавалася, калі мы вярталіся дадому — прамоклыя да ніткі, з расчырванелымі тварамі, — расказвае Уладзімір. — За стол сядалі гадзін у восем-дзевяць. Пад прагляд савецкіх фільмаў сястра ела сваю любімую салату з крабавымі палачкамі і кукурузай, а я — аліўе. Бульба, смажаная курыца, клубнічны кампот. Акрамя таго, нашае застолле ніколі не абыходзілася без пячоначнага торціка. І хаця мандарыны дэфіцытам не былі, для мяне яны і па сённяшні дзень застаюцца выключна навагоднім фруктам. Ем іх толькі ў ноч з 31-га на 1-е.

Хлопец успамінае, як кожны год яны з сястрой хацелі дачакацца таямнічых дванаццаці гадзін ночы, але засыналі яшчэ да адзінаццаці. Раніцай ехалі ў Гомель. Там чакаў працяг застолля і сюрпрызы пад ёлкай.

— Першым падарункам, які мне запомніўся, быў цацачны трактар. Нічога дзіўнага, улічваючы, што бацькі працавалі на заводах, якія выпускалі сельгастэхніку. У школьным узросце самымі жаданымі навагоднімі падарункамі сталі машынкі-трансформеры і пластыкавыя пісталеты...

Сёння амаль любое свята — ад юбілею і хрэсьбін да карпаратыву і вяселля — суправаджаецца феерверкамі. Для дзяцей 90-х агеньчыкі ў небе былі рэдкасцю. Пачуўшы залпы, малыя прыліпалі да вокнаў ці выбягалі на вуліцу, каб хоць на імгненне ўбачыць цуд піратэхнікі.

Адзіны момант, калі Уладзімір адчуў на сабе «цяжкасці» эпохі, — ранішнік у дзіцячым садку. Тады хлопца адзелі ў касцюм сняжынкі, які дастаўся ў спадчыну ад сястры. Але ніякай няёмкасці не было. Хто сказаў, што сняжынкамі могуць быць толькі дзяўчаты?

**Ганна КУРАК.**

*Мінск — Гомель — Лунінец — Мінск.*

# «НЯБЁСЫ» НА ПЛЯЧАХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Зрэшты, не. Пачаць лепш з таго, як драматычны акцёр наогул трапіў у храм. Тым больш што ў гэтай гісторыі перапляліся і любоў, і творчасць, і цуд. Калі расказваць яе вельмі сцісла і спрошчана, то вырашальную ролю адыгралі два моманты: развагі пра сэнс жыцця, якія рана ці позна прыходзяць да кожнага чалавека, і прыклад каханай жонкі Людмілы. Яе, артыстку тэатра лялек, запрасілі паўдзельнічаць у спектаклі, які сястрынства ў гонар прападобнапакутніцы вялікай княгіні Елісаветы ладзіла ў інтэрнаце для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Людміла Ждановіч прыйшла раз, другі — і засталася. А потым літаральна прыцягнула ў Свята-Елісавецінскі манастыр мужа, хоць той напачатку не праяўляў імпэту.

«Я вельмі добра помню першыя сустрэчы, спектаклі — наогул упершыню ўбачыў столькі асаблівых дзяцей, у якіх былі розныя дыягназы, вельмі розная ступень захаванасці фізічных і інтэлектуальных магчымасцяў, — шчыра гаворыць Аляксандр Ждановіч. — Як я думаў, многія з іх нават не разумелі, што адбываецца, хоць мы выбралі самы просты дзіцячы спектакль, і таму ўся справа падавалася бессэнсоўнай. Але ўбачыў людзей, якія гарэлі справай і вельмі хацелі яе працягнуць, — матушка Марфа, іншыя манахіні, поўныя такой унутранай прыгажосці, якую рэдка сустрэнеш у свецкім грамадстве. Убачыў і асэнсаваў, якое несалодкае жыццё ў гэтых «асаблівых» дзяцей, як ім патрэбна дапамога звонку. І напэўна, мне стала сорамна, што іншыя робяць, а я не: прыйшоў другі раз, трэці... А потым, не ведаю чаму, мяне туды проста пацягнула зноў і зноў. Насамрэч з «асаблівымі» людзьмі, у якіх, напрыклад, сіндром Дауна, можна наладзіць кантакт, і ён будзе больш шчыльны, чым з іншымі. Нават калі знешне яны не вельмі прываблівыя, але чыстыя ўнутры, і таму душа побач з імі адпачывае: не трэба насіць ніякія маскі, адпавядаць дрэс-коду, камусьці штосьці даказваць... Гэтыя дзеці жывуць вельмі простымі пачуццямі: смачны абед — добра, сонейка свеціць — добра, прыемны чалавек прыйшоў у госці — выдатна, а калі яшчэ нейкую забаўку прапанаваў — наогул цудоўна; і ад цябе нічога не чакаюць, акрамя таго, каб ты быў побач і даваў зразумець, што любіш іх... Разважаць на гэту тэму можна бясконца, але галоўнае — я адчуў, што мне з імі добра».

Працуючы з «асаблівай» аўдыторыяй, Аляксандр Ждановіч стварыў першы ў Мінску інклюзіўны тэатр «Радасць» і аднайменную дзіцячую тэатральную студыю — і паставіў з дзецьмі з інтэрната ў Навінках спектакль «Маленькі прынц», які стаў адметнай творчай з'явай. А вось Маляваныч з «Калыханкі» адышоў у гісторыю: як прызнаецца акцёр, цаніць гэту сваю іпастась ён пачаў толькі пасля развітання з ёй і часам сумуе па Маляванычу, вечным дзіцяці і дзіваку.

...Першы фестываль «Нябёсы» быў зладжаны ў 2015 годзе суполкай аднадумцаў, якія загарэліся ідэяй сабраць пад адным дахам батлеечныя і лялечныя тэатры. «Пачалося ўсё, як ні банальна гэта прагучыць, з мары. З сястры міласэрнасці нашага манастыра Людмілы Ждановіч — дыпламаванай актрысы тэатра лялек, якая праз усё жыццё пранесла ўнутранае дзяцінства, шчырасць, адкрытасць і ў нечым наіўнасць. Менавіта яна прынесла ў манастыр батлейку — і тут малявалі чарцяжы, рабілі батлеечныя скрыні, ставілі вучэбныя спектаклі, а потым нават ездзілі з імі на гастролі па Беларусі, у Расію, у замежжа...

Людміла, якая ў свой час кінула ўніверсітэт, дзе паспяхова правучылася тры гады па спецыяльнасці «матэматыка», і пайшла ў тэатральна-мастацкі інстытут, была не проста актрысай-лялечніцай, а лялечніцай апантанай. І, таксама вырашаючы для сябе пытанні творчасці і веры, яна марыла пра тое, каб у манастыры з'явіўся свой батлеечны фестываль». Тады гэта гучала неверагодна, але мара, вера ў свае сілы і спадарожных людзей ды яшчэ атрыманае блаславенне — усё ў сукупнасці дало плён. Хоць першы фестываль быў вельмі сціплы і камерны — 11 калектываў, выключна беларускіх, аматарскіх, скліканых ці не па сарафанным радыё: Людміла запрасіла сяброў, тыя расказалі знаёмым, знаёмым знаёмых і г. д. «Добра помню батлейку дзіцячага садка з Гродна: іхняя скрыня складалася з шафак для раздзявальні, лялькі былі саматробныя, і, можа быць, не заўжды гэта вызначалася высокім мастацкім густам, але было зроблена так шчыра і з такім імпэтам, які акупляў усе агрэхі».

У канцы 2015-га Людміла Ждановіч пайшла з жыцця — на нябёсы. А вось яе творчае дзіця, фестываль «Нябёсы», наадварот, «прызямлілася» і прапісалася ў Свята-Елісавецінскім манастыры. Фестываль пашырыўся ў часе — да чатырох дзён, і геаграфіі — акрамя беларускіх тэатраў, у ім у розныя гады ўдзельнічалі калектывы з Украіны, Літвы, Расіі, Эстоніі, Вялікабрытаніі, Германіі, Польшчы. «Ужо на першым фэсце мы пазнаёміліся з многімі цікавымі людзьмі, напрыклад з Канстанцінам Пятрыманам з Міра, літаральна заканаым у батлейку як від мастацтва, у яе гісторыю і традыцыі, і ён стаў пастаянным нашым удзельнікам. Потым да нас прыехаў супермайстар батлеечнай справы, старшыня батлейкавага руху Расіі рэжысёр Аляксандр Грэф. Наогул, кожны год прыносіць і творчы вопыт, і новыя цікавыя знаёмствы, — згадвае Аляксандр Ждановіч. — І калі раней мой удзел у фестывалі абмяжоўваўся тым, што Люда — мая жонка, а я дапамагаю ажыццявіць яе мару, то потым і сам я закахаўся ў батлейку, зразумеў яе прыгажосць і глыбіню. Паступова ад выключна калядной тэматыкі мы прыйшлі да слогана «З лялькай да Бога» — гэта значыць усе пастаноўкі, у якіх ёсць лялькі і размова ідзе пра галоўныя чалавечыя, хрысціянскія каштоўнасці, — адпавядаюць духу нашага фестывалю».

«Лялечнае мастацтва насамрэч часам глыбейшае за драматычны тэатр і здольна перадаць такія рэчы, якія ніяк інакш не пакажаш. Мне падабаецца азначэнне, што такое блюз: гэта калі добры чалавек спявае сумную песню. Што такое лялечны тэатр? Гэта калі добры чалавек бярэ ў рукі ляльку і «ажыўляе» яе. Як мне здаецца, быць лялечнікам і не быць добрым чалавекам проста немагчыма».

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **30.01.2019** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **28.01.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

**Считать недействительными утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций и бланки страховых полисов:**

– квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии СВ №№ 0563165, 0563167, 0563176, 2264154;

– полисы «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ №№ 1657341, 1657342, 1657347, 1657370, 1657375, 1657378, 1657379, 1749059, 1485220, 1186003, 1762032, 1718918, 1718919, 1718920, 1765201, 1269438, 1269439;

– полис «Добровольное страхование от несчастных случаев» формы 2РН, 2РП серии НС № 0037899.

УНП 100782388

## Фотаконкурс

**Газета «Звязда» сумесна з Міністэрствам інфармацыі праводзіла рэспубліканскі творчы фотаконкурс «Шчаслівая сям'я». Даслаць свае здымкі і падзяліцца ўсмешкамі татаў, мам і дзяцей маглі як прафесійныя фатографы, так і аматары. Усяго на конкурс паступіла каля 250 работ. На старонках «Сямейнай газеты» друкуем найлепшыя з іх.**



**«ЗІМОВЫЯ ЗАБАВЫ».**
**Фота Марыны БРУЯКІ (Мінск).**
**Намінацыя «Сямейныя традыцыі».**



**Фота Наталлі ЕВЯНКО (Акцябрскі). Намінацыя «Разам працуем — разам адпачываем».**

## Мама, пачытай!

# ПАЎКІЛО МАНДАРЫНАЎ



Я крочыла па зімовай вуліцы і каля прыпынку заўважыла бабулю — яна гандлявала мандарынамі. Тата кажа: вулічным гандлем часта займаюцца махляры, невядома, якой якасці ў іх прадукты. Я зірнула на бабулю. Яе позірк здаўся мне добрым. Я падумала: бабуля ніякая не махлярка, а звычайная, як і мая. Падышла да яе і пацікавілася, колькі каштуюць мандарыны. Бабуля назвала цану. Грошай на кілаграм у мяне не хапала, але якія-ніякія ўсё ж былі. Я працягнула іх бабулі.

Яна зірнула на манеты, на мяне, сказала:

— Зусім мала, унучка. Але я ўзважу больш.

Бабуля паклала на вагу мандарыны — я заўважыла, як стрэлка спынілася на пяцістах грамах. Яна паклала мандарыны (восем штук) у невялічкі пакет і дала яго мне. Я падзякавала і пайшла.

Насустрач крочыла жанчына з маленькім хлопчыкам. Хлопчык убачыў пакет з мандарынамі і звярнуўся да маці:

— І я хачу мандарыны. Давай купім!

— У нас няма часу. Мы і так спазняемся.

Я дастала з пакета мандарынку і працягнула хлопчыку.

— Скажы дзякуй дзяўчынцы, — падказала маці.

— Дзякуй, — паўтарыў хлопчык і падняў на мяне вочы. У іх з'явіліся іскрынкі радасці і шчырай удзячнасці.

Я падумала, што гэтага мандарына ў мяне магло і не быць, бо на яго ў мяне ўсё роўна не хапала грошай. Атрымліваецца, бабуля пачаставала мяне, а я — хлопчыка.

Тут да мне дайшло: «Я ж сама яшчэ іх не пакаштавала!»

Дастала адзін з пакета і пачала здымаць лупіну. Потым адарвала дзве долькі і пакаштавала. Якая прыемная слодыч! Мандарын, вядома, не аўсяная ці грэцкая каша, якую даюць у школьнай сталовай. Лепш бы замест іх нам давалі мандарыны! Але гэта толькі мары...

— Дзяўчынка, давай памяняемся! — пачула раптам. — Я дам табе цукерку, а ты мне — мандарын.

Азірнулася і ўбачыла побач з сабой сямівасьмігадовую малую, якая працягвала мне цукерку. Нічога не засталося, як дастаць з пакета мандарын і працягнуць ёй. Затое ў мяне з'явілася цукерка «Мішка на Поўначы».

— А ў мяне ёсць цацка з кіндар-сюрпрыза — качаня. Яе можна выкарыстаць як бірульку. Давай мяняцца, — прамовіла яшчэ адна дзяўчынка, мая равесніца. Яна, пэўна, таксама ішла са школы.

Так у мяне з'явілася цацка.

Я падумала, якая цудоўная пара года — зіма. На двары холад, сцюжа, гурбы снегу, пахмурна. І якраз у гэты час у нас прадаюцца мандарыны, якія прывозяць з цёплых краін. Мандарын — як невялічкае сонца, яркааранжавы і такі смачны! Ён нагадвае пра лета, а таму ўзнімае настрой.

Каля самага пад'езда заўважыла бабулю Ніну, якая жыве паверхам ніжэй. Летам яна часта сядзіць на лавачцы каля дома, а вось зімой больш часу праводзіць у кватэры. На вуліцу выходзіць толькі ў краму ці па нейкіх неадкладных справах. Калі ў бабулі Ніны ёсць цукеркі, яна частуе мяне. Так што мы, так бы мовіць, сябры.

Заўважыўшы ў маіх руках пакет з мандарынамі, яна сказала:

— І я сёння ў краму хадзіла. Але там такая чарга ў аддзеле садавіны, што не рызыкнула стаяць.

Я дастала мандарын і працягнула яго бабулі.

— Гэта вам. Няхай ён вас парадуе.

— Дзякуй, Насцечка, — узрадавалася старэнькая.

Я паднялася на свой паверх і адчыніла кватэру, адкуль адразу павеяла цяплом. Распранулася і аднесла на кухню пакет з мандарынамі. У ім заставалася тры штукі — адзін для мяне і два для бацькоў. А яшчэ ў маёй кішэні ляжалі цацка і цукерка. Я ўспомніла сённяшні дзень і падумала, што добрая справа заўсёды прыцягвае добрую, дрэнная — дрэнную. Гэта прынцып звычайнага ланцужка.

У гэты момант мне захацелася, каб «добрых» ланцужкоў у жыцці кожнага чалавека было як мага больш.

**Андрэй СІДАРЭЙКА.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

### НА СВЯТОЧНЫ СТОЛ

## НАВАГОДНЯЕ «ПАРАСЯ»



***Спатрэбіцца:*** *бульба — 1,5 кг, філе курыцы — 0,5 кг, шампіньёны — 700 г, цыбуля рэпчатая — 1 шт., 1 буйная морква, яйкі — 2 шт., сыр — 100 г, масла — 50 г, алей для смажання, соль на смак, 1 лыжачка молатай салодкай папрыкі, молатая каляндра — 1 ч. л., молаты чорны перац — 0,5 ч. л., зяленіва для ўпрыгажэння.*

З бульбы зрабіць пюрэ і ў цёплае (не гарачае!) дадаць сырыя бялкі яек і добра перамяшаць! Філе курыцы, нарэзанае на невялікія кавалачкі, злёгку абсмажыць на алеі, затым пасаліць і, насыпаўшы спецыі, тушыць да выпарвання вадкасці. Далей дадаць да курыцы цыбулю, нарэзаную паўколцамі, і моркву, надзёртую на буйной тарцы, і смажыць да гатоўнасці. Грыбы, пасаліўшы, патушыць з каляндрай у масле. Потым падзяліць іх на дзве часткі: буйнейшыя пакінуць на ўпрыгажэнне, астатнія змяшаць са смажанай курыцай.

На бляху заслаць ліст фольгі, прамазаць яго маслам і выкласці палову пюрэ. Фармуем з яго нарыхтоўку: «парася» з борцікамі, але без верху. Запоўніць начынкай з курыцы з грыбамі, зверху пасыпаць надзёртым сырам. Сыр сыпаць у сярэдзіну (адступаючы ад бартоў, каб не правалася «парася» і не выцекла!). Астатнюю частку бульбы выкласці па версе, фармуючы «парася», добра разгладжваючы сіліконавай лапаткай. Цалкам абмазаць «парася» жаўтком яек і зрабіць з морквы вушкі, лычык (ноздры — духмяны перац) і хвосцік. Адправіць «жывёліну» ва ўжо разагрэтую духоўку і пакінуць там пры тэмпературы 220 градусаў на 25 хвілін.









## САЛАТА З ФАРЭЛІ І АГУРКОЎ

***Спатрэбіцца:*** *салёная або вэнджаная фарэль — 150 г, свежыя агуркі — 1-2 шт., дыжонская гарчыца — 1 ч. л., аліўкавы алей — 2-3 ст. л., паўлімона, мёд — 1 ч. л., лісце салаты — жменя, соль і перац — на смак.*

Агуркі нарэзаць паўколцамі. Фарэль нарэзаць тонкімі палоскамі або лустачкамі. Сок паловы лімона, мёд і гарчыцу змяшаць з аліўкавым алеем. Пасаліць і паперчыць на смак. Лісце салаты старанна вымыць, абсушыць. Выкласці на дно салатніцы. Зверху размеркаваць рыбу і нарэзаныя агуркі. Паліць салату запраўкай і адразу падаць да стала.

### МАЙСТАР-КЛАС







«ХАТУ МЯЦІ, А ШУМУ ВОН НЕ НЯСІ!» (Беларуская прыказка.)



# БІЗНЕС У ГЛЫБІНЦЫ — ГЭТА ВЫГАДНА

## і для прадпрымальнікаў, і для ўсёй мясцовасці



**Невялікі Ельскі раён знаходзіцца на поўдні Беларусі і мяжуе з Украінай. Больш як 57 % яго плошчы займаюць лясы. Вялікую долю ў яго развіццё ўносіць аграрны сектар — звыш 50 % валавой прадукцыі раёна даюць менавіта сельгаспрадпрыемствы. І хоць землі тут не надта ўрадлівыя, сёлета атрымалася нарыхтаваць 30,5 кармавой адзінкі на ўмоўную галаву жывёлы. Значыць, ёсць неабходная база, што дазволіць атрымліваць малако і мяса, гаворыць старшыня Ельскага райвыканкама Уладзімір БУРМІСТРАЎ:**

— Калі яшчэ нядаўна кармавая база ў сельгаспрадпрыемствах раёна была ў вялікім недахопе, то другі год запар мы кормім жывёл згодна з рацыёнам. Зразумела, летняя спякота вельмі значна адбілася на канчатковых выніках працы сельгасвытворцаў, тым не менш у дзвюх гаспадарках створаны паўтарагадовы запас кармоў. Летась уласнымі сіламі адрамантавалі два хлявы ў дзвюх гаспадарках раёна, і сёлета будавалі навесы і жывёлагадоўчыя памяшканні для дарошчвання буйной рагатай жывёлы. У планах — на кожным сельгаспрадпрыемстве пабудаваць такія памяшканні. У перспектыве ў КСУП «Скараднянскі» пабудуем паўнавартасную малочнатаварную ферму. Час патрабуе наладзіць сельгасвытворчасць па сучасных тэхналогіях.

Сёлета чатыры вуліцы ў Ельску былі капітальна адрамантаваны. Мы ўвялі ў строй дом сямейнага тыпу, пачалі будаваць 45-кватэрны дом, які плануем увесці ў строй налета. У планах — будаўніцтва яшчэ аднаго аналагічнага дома. Гэтыя праекты атрымалася ажыццявіць за кошт сродкаў абласнога бюджэту. За сродкі, выручаныя ад раённага суботніка, набылі спартыўнае абсталяванне, якое будзем устанаўліваць на пляцоўцы каля спартыўнай школы.

У 2015 годзе да абласнога свята «Дажынкі» Ельск быў цалкам прыведзены ў парадак, вуліцы адрамантаваны і пашыраны. Цяпер мы падтрымліваем гэта і працягваем добраўпарадкаванне. Сёлета на возеры ў Ельску зрабілі фантан, адрамантавалі дарожкі, паставілі лаўкі для адпачынку. Прыемна, што ініцыятыву ўладаў падхопліваюць у сельскіх Саветах. У аграгарадках Млынок і Рамязы зроблены прыгожыя дзіцячыя пляцоўкі на месцах знесеных будынкаў. Увогуле ж мы імкнёмся пабудовы, што не выкарыстоўваюцца, прадаць за адну базавую велічыню, каб новыя гаспадары іх адрамантавалі і наладжвалі там вытворчасць.

Некаторыя з новых прыватных прадпрыемстваў заснаваны мясцовымі жыхарамі, іншыя — прадпрымальнікамі, якія прыязджаюць да нас са сталіцы краіны. Яны лічаць, што развіваць бізнес менавіта ў глыбінцы больш прывабна. Такія прадпрыемствы атрымліваюць пэўныя падатковыя палёгкі, тут больш танная рабочая сіла і зусім іншыя адносіны. Мы на руках носім кожнага прадпрымальніка, які ўкладаецца ў развіццё нашага раёна. У планах — рэалізацыя некалькіх вытворчых інвестыцыйных праектаў, у тым ліку ў аграгарадку Дабрынь. У рэшце рэшт гэта дзейнасць дасць рабочыя месцы і грошы ў мясцовы бюджэт.

*Ад усёй душы віншую ўсіх з Новым годам! Няхай у 2019-м з'явяцца новыя перспектывы і ўвасобяцца ў жыццё пастаўленыя задачы! Няхай у доме будзе дастатак, а ў сем'ях — мір і любоў. Усім моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту!*

# Гісторыя, дасягненні, славутасці Ельшчыны

**У VII—IX стагоддзях тэрыторыю раёна засялялі плямёны дрыгавічаў. У розны час землі ўваходзілі ў склад розных дзяржаў. У X стагоддзі — у склад Кіеўскай Русі, з сярэдзіны XIV — у склад Мазырскага павета Вялікага княства Літоўскага. Пасля Люблінскай уніі (1569 г.) Ельск у складзе Рэчы Паспалітай, а пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай (1793 г.) ён становіцца мястэчкам Міхалкаўскай воласці Мазырскага павета Мінскай губерні Расійскай імперыі.**

Паходжанне назвы «Ельск» не такое празрыстае, як здаецца на першы погляд. Елкі на поўдні Палесся ніколі не раслі, не растуць і цяпер. У аснове тапоніма Ельск, сцвярджаюць навукоўцы, хутчэй за ўсё, ляжыць назва невялікай рэчкі Елы ці Елкі, якая тут некалі існавала. Гідронім утварыўся ад фіна-ўгорскай асновы «ел» — «крыніца, лясны раўчук, рэчка». Іншыя даследчыкі сцвярджаюць, што з канца XVII стагоддзя на паўднёвым Палессі жылі і валодалі мясцовымі землямі памешчыкі Ельскія. Быццам, ад іх прозвішча гэты населены пункт стаў называцца Ельскам.

Цяпер у Ельскім раёне пражывае каля 15 тысяч чалавек.

***

— Сёлета намеснік дырэктара ясляў-сада-сярэдняй школы з аграгарадка Рамязы Людміла Трошка стала пераможцай абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу школьных праектаў па эканоміі і ашчаднасці «Энергамарафон». Установе адукацыі ўручаны сертыфікат на суму 30 000 рублёў.

— Вакальны ансамбль «Рэха» Ельскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі заваяваў дыплом I ступені на Міжнародным фестывалі-конкурсе «Творчасць без меж».

— Мікалай Паўлаў, навучэнец Ельскай раённай гімназіі стаў пераможцам заключнага этапу рэспубліканскага тэлевізійнага праекта «Я ведаю!», які праводзіць Белтэлерадыёкампанія сумесна з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Да конкурсу школьніка падрыхтавала настаўнік Юлія Новак.

— У Год малой радзімы ў Ельскім раёне праведзены музычны фальклорны форум «Напеў роднай зямлі», які даў магчымасць сустрэцца 150 аматарам-гарманістам, аматарам народнай творчасці з шасці рэгіёнаў Гомельскай і Житомирскай абласцей.

— У раённай цэнтральнай бібліятэцы Ельска сабрана ўнікальная калекцыя вышытых прадметаў народнага побыту, элементаў народнага касцюма, характэрных для Ельшчыны перыяду 50—70-х гадоў мінулага стагоддзя «Вёска зніклая, але не забытая».

***

— У Ельскім раёне да аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь належаць сем матэрыяльных нерухомых аб'ектаў: Свята-Траецкая царква — узор драўлянага народнага дойлідства XVIII стагоддзя, а таксама магілы ахвяр фашызму ў вёсках Жукі, Будкі, Кочышчы, Чэрцень, дзве — у Ельску.

— Ёсць і ўнікальны аб'ект праявы творчасці чалавека — мясцовы песенны стыль аўтэнтычнага фальклорнага калектыву вёскі Казлы. Ён мае статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны краіны.

— Знакаміты Кацярынінскі шлях з Пецярбурга на Валынь, пабудаваны некалі па загадзе расійскай імператрыцы Кацярыны II, у канцы XVIII — пачатку XIX стагоддзя праходзіў праз многія населеныя пункты Ельскага раёна. Па гэтай дарозе праязджалі імператар Мікалай I са сваёй сям'ёй і славуты палкаводзец Міхаіл Кутузаў. У паўднёвую ссылку па гэтых мясцінах ехаў паэт Аляксандр Пушкін.

— У наваколлі вёскі Дзвіжкі растуць дзіўныя помнікі прыроды — чорныя бярозы, у Качышчанскім лясніцтве — хвоя-чаша. Тут можна сустрэць многіх прадстаўнікоў жывёльнага і расліннага свету, якія занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Напрыклад, кураслеп дуброўны, фіялка багнавая, жоўтая лотаць, розныя віды папараці, венерын чаравік, багун, балотны верас... У Ельскіх лясах можна пабачыць лася, дзіка, барсука, рысь, бабра, янота...

# ГАЛОЎНАЯ СВЯТЫНЯ ЕЛЬСКА

**Ельская Траецкая царква — помнік драўлянага дойлідства, які прыцягвае ўвагу і вернікаў, і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй і краязнаўствам.**

Царква была пабудавана са звычайнай палескай хвоі ў 1769—1780 гадах у мястэчку Каралін (так называўся ў той час Ельск). Храм з элементамі стыляў барока і класіцызму ў выглядзе крыжа з'явіўся па ініцыятыве і на сродкі памешчыка Казіміра Аскеркі спецыяльна для цудатворнай Васькаўскай іконы Божай Маці. У 1870-х гадах да царквы была прыбудавана трох'ярусная званіца.

Ні ў Першую, ні ў Другую сусветныя войны драўляная царква не пацярпела.



Толькі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны яна была закрыта і пераўтворана ў збожжавы склад, але зноў адкрылася ў 1943 годзе. У храме знаходзіцца святыня — копія Васькаўскай іконы Божай Маці. З гэтым абразом звязана цікавая легенда.

Неўзабаве пасля з'яўлення абраза каля яго пачалі адбывацца цуды. Вестка пра гэта хутка разляцелася па ўсім наваколлі, і да выявы сталі сцякацца вернікі. З 1773 да 1787 года цуды, якія здзяйсняліся пасля малітвы перад Васькаўскай іконай, былі апісаны ў кніжцы, што захоўвалася ў прыходскай царкве сяла Мялешкавічы, да якой была прыпісана Васькаўская царква. У 1817 годзе па хадайніцтве мінскага губернатара Казіміра Сулістроўскага знакаміты абраз быў перанесены ў ельскую Траецкую царкву.

Сёння ельскі Траецкі храм мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і знаходзіцца пад ахoвай дзяржавы.



# ПРАМЯНІ ТАЛЕНТУ ЯЎГЕНІІ ШАДРЫНАЙ

**Яна сама грае, спявае, касцюмы шые і іншых уцягвае ў свае кіпучыя творчыя справы. Гавораць, спяваць здольная навучыць нават тых, каму мядзведзь вушы адтаптаў.**



Вось ужо на працягу 17 гадоў Яўгенія Шадрына кіруе Зашырскім культурна-спартыўным цэнтрам. Аб'яднала вакол сябе аднадумцаў і разам яны робяць усё, каб аграгарадок Зашыр'е ведалі не толькі на Ельшчыне. Дарэчы, тры гады запар гастралююць удзельнікі мясцовага ўзорнага ансамбля «Сонейка» ў розных гарадах Германіі. Творчыя калектывы і асобныя выканаўцы цэнтра неаднаразова станавіліся стыпендыятамі прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай творчай моладзі.

Кожны з праектаў Яўгеніі Аляксандраўны варты ўвагі і асобнага аповеду. Напрыклад, яна стала ініцыятарам стварэння «Вуліцы выселеных вёсак» і «Рамеснага двара». У выніку этнаграфічных экспедыцый па Ельскім раёне пры цэнтры створана краязнаўчая база, якая ўключае ўспаміны старажылаў, фота і відэаматэрыялы, а таксама прадметы сялянскага побыту.

Расіянка, якая некалі за мужам прыехала з вялікага Чэлябінска ў самую глыбінку беларускага Палесся, сёння ведае яго традыцыі, робіць усё, каб яны працягваліся і жылі ў нашчадках. Напрыклад, займаецца адраджэннем старадаўніх рамёстваў. Прычым, прапануе не толькі тэарэтычна азнаёміцца з імі, але і сваімі рукамі ў ганчарнай майстэрні вылепіць посуд па старадаўняй тэхналогіі. Самаробныя скульптуры — яшчэ адзін з кірункаў дзейнасці і несуцішнага таленту Яўгеніі Шадрынай.

Сем з 25 клубных калектываў маюць ганаровыя званні «народны (узорны) калектыў аматарскай творчасці». Многія з іх да таго ж з'яўляюцца дыпламантамі і ўдзельнікамі фестываляў, конкурсаў розных узроўняў — ад раённых да міжнародных.

Штогод работнікамі культурна-спартыўнага цэнтра праводзіцца больш за 250 мерапрыемстваў для жыхароў сельскай мясцовасці. Пра яе лідарскія здольнасці ў раёне ходзяць легенды. Але ж самае галоўнае — тут, у Зашыр'і, культурнае жыццё віруе, тут нараджаюцца цікавыя ідэі, тут рэалізуюцца самыя дзёрзкія планы і задумкі.

Нездарма сёлета дырэктар Зашырскага КСЦ Яўгенія Шадрына атрымала высокую дзяржаўную ўзнагароду — медаль Францыска Скарыны: за шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм і ўзорнае выкананне службовых абавязкаў у сферы культуры і мастацтва.

**Матэрыялы падрыхтавала Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# Зручныя і элегантныя крэслы

## Ельская мэблевая фабрыка — самы буйны вытворца крэслаў з драўнянага масіву ў Беларусі

**Складана ўявіць сабе жыллё ці офіснае памяшканне, у якім бы не было крэслаў. Яны нясуць не толькі рабочую функцыю. Іх вонкавы выгляд і форма з'яўляюцца важнай часткай дызайну памяшкання, уплываюць на інтэр'ер і яго атмасферу.**


Выконваючая абавязкі дырэктара Ельскай мэблевай фабрыкі вядучы тэхнолаг Алена ПТУХА.

На Ельскай мэблевай фабрыцы ажыццяўляецца поўны вытворчы цыкл вырабу крэслаў з масіву дрэва: ад раскрою піламатэрыялаў, сушкі загатовак, механічнай апрацоўкі да зборачна-аддзелачных работ. Для вытворчасці крэслаў і іншай мэблі існуе спецыяльная тэхналогія са сваімі тонкасцямі.

Старанны выбар дрэва лічыцца адным з самых адказных этапаў. Для вырабу мэблі прадпрыемства выкарыстоўвае масіў дуба, алешыны, бярозы, хвоі высокіх гатункаў. Кожны від лесаматэрыялаў характарызуецца сваімі ўнікальнымі і непаўторнымі якасцямі. З якой драўніны лепш купіць мэблю — вырашаць толькі пакупніку.

Працэс вырабу крэслаў пачынаецца з раскрою лесаматэрыялаў на піламатэрыялы, затым — на чарнавыя загатоўкі, якія сушаць да вільготнасці 8 плюс-мінус 2 %. Ад таго, наколькі правільна была высушана сыравіна, залежыць эксплуатацыя крэслаў. Пры далейшай (канчатковай) апрацоўцы чарнавых загатовак атрымліваюць чыставыя загатоўкі, якія ідуць на вытворчасць дэталяў.

Выраб крэслаў — складаны і вузкаспецыялізаваны працэс, у якім ужываюцца практычна ўсе віды дрэваапрацоўчага абсталявання. Акрамя таго, для вырабу крэслаў выкарыстоўваецца і спецыяльнае абсталяванне, якое не ўжываецца ў вытворчасці іншых відаў мэблі. Напрыклад, на Ельскай мэблевай фабрыцы ёсць італьянская фрэзерна-прафілюючая лінія і пяцівосевыя апрацоўчыя цэнтры з лічбавым праграмным кіраваннем. Сучаснае абсталяванне для вытворчасці крэслаў дазваляе прадпрыемству атрымліваць якасную прадукцыю з мінімальнай стратай сыравіны.

**Выконваючая абавязкі дырэктара, вядучы тэхнолаг Ельскай мэблевай фабрыкі Алена ПТУХА** гаворыць, што нават просты на выгляд табурэт зрабіць не так лёгка, як здаецца на першы погляд. Тым больш — зручнае крэсла:

— На сёння ў Беларусі не так шмат прадпрыемстваў, якія займаюцца вытворчасцю крэслаў з масіву, што збіраюцца на шыпавых злучэннях, а гэта значна павялічвае трываласць крэсла і, такім чынам, тэрмін яго эксплуатацыі. Вытворчасць крэслаў — вельмі працаёмкі тэхналагічны працэс. Пры іх канструяванні ўлічваецца кожная дробязь. Калі дэталі не супадуць нават на адзін градус ці міліметр, крэсла не збярэцца. Таму заўсёды ідзе вельмі дакладная падгонка нават пасля зборкі. Важна, каб крэсла было абсалютна ўстойлівым. Нашы супрацоўнікі — сапраўдныя прафесіяналы. Яны гадамі набывалі ўнікальны вопыт вытворчасці крэслаў.

Мэбля з масіву драўніны ва ўсе часы застаецца актуальнай і эксклюзіўнай. Гэта звязана ў першую чаргу з экалагічнай чысцінёй матэрыялу і яго даўгавечнасцю. Мэбля з разнастайных каштоўных парод драўніны здольная ўпрыгожваць не толькі дом, але і элітныя кабінеты кіраўнікоў, клубы і камерцыйныя банкі, рэстараны і іншыя прэстыжныя памяшканні.

Крэслы з'яўляюцца нязменным атрыбутам любога памяшкання. Эксклюзіўныя, з масіву дрэва і з надзейнай канструкцыяй ды арыгінальным дызайнам дазволіць сабе купіць можа не кожны, але калі яны з'явіліся ў доме, то будуць служыць дзясяткі гадоў.

Мадэльны рад сталоў і крэслаў Ельскай мэблевай фабрыкі галоўным чынам мае традыцыйную скіраванасць. Класічны стыль трывала ўмацаваўся ў дызайне інтэр'ера. Заўсёды актуальны, ён увасабляе ўтульнасць, рэспектабельнасць і вытрыманую раскошу.

Крэслы Ельскай мэблевай фабрыкі ў класічным стылі маюць шэраг характэрных асаблівасцяў. Іх канструкцыя мае сіметрычныя, прапарцыянальныя формы. Усе акругласці і выгібы вывераны з дакладнасцю да міліметра, каб забяспечыць максімальны камфорт для спажыўца.

Матэрыялы для абіўкі адпавядаюць абранаму стылю. Часцей за ўсё ўжываецца жакард з прыгожым узорам і рэльефнай фактурай. Малюнак тканіны можа быць у выглядзе кантрасных палос, мудрагелістых узораў, геаметрычных арнаментаў і кветак.

Тэндэнцыі сучаснага дызайну вельмі рухомыя. Яны дыктуюць новыя формы ўзаемадзеяння стыляў і матэрыялаў. Таму на Ельскай мэблевай фабрыцы цяпер вядзецца актыўная работа па абнаўленні асартыменту прадукцыі, укараняюцца новыя і ўдасканальваюцца існуючыя тэхналагічныя працэсы.

Вытворчасць прадукцыі, якая адпавядае стандартам якасці і патрабаванням спажыўцоў, адкрыла магчымасці для супрацоўніцтва з Расіяй, Казахстанам, Літвой, Эстоніяй і іншымі краінамі. Пры гэтым для кожнай з краін-партнёраў на Ельскай мэблевай фабрыцы вырабляюць прадукцыю не толькі масавай вытворчасці, але і мэблю па індывідуальных заказах. Прадпрыемства заўсёды адкрытае для супрацоўніцтва і гатовае ўвасобіць у жыццё мадэлі мэблі любой складанасці і дызайну.

Стратэгічнай мэтай з'яўляецца перспектыўнае развіццё прадпрыемства, якое заключаецца ў стварэнні ўмоў для прыцягнення інвестыцый, накіраваных на тэхнічнае пераўзбраенне вытворчасці, пашырэнне асартыменту прадукцыі, зніжэнне сабекошту, забеспячэнне прыбытку, замацаванне пазіцый на беларускім рынку, выхад на новыя рынкі збыту.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### Гістарычная даведка

**Стварэнне прадпрыемства адносіцца да 1914 года. Тады купцы Маргоўскі і Ліўшыц пабудавалі ў Ельску невялікі лесапільны завод, які размяшчаўся ў адным драўляным будынку. Прадпрымальнікі пачалі перапрацоўку драўніны хвой і дубоў, якія раслі ў гэтых мясцінах.**

**У 1935 годзе на прадпрыемстве пачалі вырабляць мэблю, а з 1960-га — асвойваць вытворчасць крэслаў. У 2016 годзе адбылося пераўтварэнне прадпрыемства ў адкрытае акцыянернае таварыства. Зараз Ельская мэблевая фабрыка з'яўляецца адным з філіялаў ААТ «Мазырскі ДАК». Прадпрыемства спецыялізуецца на вырабе крэслаў, банкетак, сталоў, мяккіх крэслаў з масіву драўніны і канап на драўляным каркасе.**



### Увага навінкам

У кастрычніку на Ельскай мэблевай фабрыцы пачалі масавую вытворчасць новай лінейкі крэслаў з мяккай абіўкай.

Крэслы «Дэрбі» і «Арланда» выглядаюць прыцягальна і элегантна. Яны маюць строгі лаканічны дызайн. Мяккая спінка крыху выгнута, што забяспечвае дадатковую зручнасць і камфорт пры эксплуатацыі. Трывалы каркас выраблены з масіву дуба і бярозы.





Для абіўкі выкарыстоўваюцца як жакардавыя тканіны, так і мікравелюр. Магчымы пашыў чахлоў на гэтыя мадэлі крэслаў пад заказ ці з тканіны заказчыка.

Мяккія крэслы выглядаюць арганічна ў інтэр'ерах розных стыляў. Дзякуючы такой універсальнасці дызайну яны падыходзяць для выкарыстоўвання як у жылых, так і ў грамадскіх памяшканнях.

- **Крэслы і мяккія крэслы Ельскай мэблевай фабрыкі ўпрыгожваюць кабінеты Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі, рэзідэнцыю Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, залы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.**
- **Народны мастак Расіі акадэмік Расійскай акадэміі мастацтваў Аляксандр Шылаў для сваёй майстэрні зрабіў спецыяльны заказ на Ельскай мэблевай фабрыцы. Ён падрыхтаваў эскізы мэблі, па якіх цяпер па ўзгадненні з аўтарам наладжаны масавы выпуск такіх крэслаў.**
- **Самую вялікую долю ў вытворчай дзейнасці Ельскай мэблевай фабрыкі займае вытворчасць крэслаў. Так, выпуск прадукцыі за 2018 год у натуральным выражэнні складаюць:**
  **крэслы — 29 850 шт.;**
  **дэталі каркасаў — 26 800 шт.;**
  **іншая прадукцыя: сталы, банкеткі, табурэты, мяккія крэслы, канапы — 3857 шт.**
- **На сваю прадукцыю прадпрыемства мае ўсе неабходныя сертыфікаты адпаведнасці Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Таксама прадукцыя сертыфікавана па еўрапейскім стандарце FSC, што гарантуе ажыццяўленне строгага экалагічнага кантролю.**



### АСАБЛІВАСЦІ КРЭСЛАЎ З МАСІВУ ДРЭВА

**Асноўным адрозненнем вырабу мэблі з масіву дрэва ад вырабу з іншых матэрыялаў з'яўляецца адсутнасць дадатковых прымешак, якія ўплываюць на якасць сыравіны. Выкананыя з масіву крэслы арганічна дапаўняюць інтэр'ер, надаюць яму элементы раскошы. Уласцівасці масіву дрэва, які валодае шырокім выбарам тэкстур, дазваляюць ствараць трывалую і элегантную мэблю, у тым ліку крэслы з максімальна працяглым тэрмінам эксплуатацыі. Характарыстыкі трываласці крэслаў з масіву значна вышэйшыя, чым з таннейшых ДВП і іншых матэрыялаў. Да таго ж драўляныя крэслы лёгка рэстаўраваць і змяняць іх вонкавы выгляд шляхам афарбоўвання. Мэбля з масіву розных парод дрэва надзейная, экалагічная і прыгожая.**

УНП 401155408.

# БЕЗ ТРАФЕЯЎ НЕ ЗАСТАНЯЦЕСЯ!

**Ельскі лясгас знаходзіцца на поўдні Гомельшчыны. Як самастойная арганізацыйна-гаспадарчая адзінка лясгас быў арганізаваны ў 1936 годзе на базе лясоў Ельскага леспрамгаса.**

## Асноўныя пакасчыкі перавыкананы

**Дырэктар Ельскага лясгаса Яўген МАТУЗКА** гаворыць, што за 11 месяцаў гэтага года забяспечана выкананне ўсіх паказчыкаў па лесагаспадарчай дзейнасці і прамысловай вытворчасці:

— У выніку суцэльных і выбарачных санітарных высечак драўніны нарыхтавана 176 тысяч кубічных метраў, зроблена лесааднаўленне і лесаразвядзенне на плошчы 366 гектараў. Планавае заданне па паступленні выручкі ад рэалізацыі прадукцыі выканана на 116 % і складае 10 307 тысяч рублёў. Тэмп росту да мінулага года — 133 %, а рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі склала 26 %. Пастаянны попыт мае прадукцыя дрэваапрацоўкі Ельскага лясгаса. Дарэчы, за 11 месяцаў года было выраблена 10,7 тысячы кубічных метраў піламатэрыялаў. Усяго адгружана на экспарт лесапрадукцыі на 1582 тысячы долараў.

Сёлета пачала ажыццяўляцца мадэрнізацыя лесапільнага цэха. Хутка ў лясгасе будзе ўстаноўлена новая лінія лесапілавання, што дазволіць павялічыць аб'ёмы драўніны, якая перапрацоўваецца, выпускаць прадукцыю з высокай дабаўленай вартасцю і, адпаведна, атрымаць дадатковы прыбытак ад рэалізацыі. Запуск лініі запланаваны на люты наступнага года. Ёсць планы ў 2020 годзе купіць завод для вытворчасці пелетаў. Тым самым пашырыцца вытворчасць, павялічыцца колькасць рабочых месцаў. Адпаведна — і прыбыткі Ельскага лясгаса.



Дырэктар Ельскага лясгаса Яўген МАТУЗКА.



З кожным годам адміністрацыйныя будынкі і тэрыторыі Ельскага лясгаса становяцца ўсё больш прыгожымі. Было закончана капітальнае будаўніцтва Скараднянскага лясніцтва, пабудаваны гаражы ў Валаўскім лясніцтве і на тэрыторыі лясгаса, уведзена ў эксплуатацыю пажарная вышка ў Зашырскім лясніцтве, да канца гэтага года завершыцца рэканструкцыя Зашырскага лясніцтва і будаўніцтва гаража ў Качышчанскім.

За 11 месяцаў было засвоена інвестыцый у асноўны капітал на суму 809 тысяч рублёў. У Ельскім лясгасе пастаянна вядзецца работа па абнаўленні машынна-трактарнага парка. Сёлета быў набыты аўтамабіль МАЗ з прычэпам, тры адзінкі УАЗа для перавозкі рабочых, аўтамабіль «Газель Нэкст», МПТ-461, два прычэпы ПЛ-9.

## Паляўнічы дом у Бабруйках

Восем кіламетраў ад Ельска — і аматар рыбнай лоўлі або палявання трапляе на тэрыторыю ўтульнага паляўнічага комплексу, які належыць дзяржаўнай лесагаспадарчай установе «Ельскі лясгас» Гомельскага дзяржаўнага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання.

Для адпачынку тут створаны ўсе ўмовы. Два дамы паляўнічага адначасова могуць змясціць 10 чалавек. Ёсць лазня, альтанка з мангалам, кухня, вальер для сабак, стаянка для машын і дзіцячая пляцоўка.

У арэндзе лясгаса — маляўнічае Бабруйкаўскае вадасховішча плошчай 104 гектары. На ім арганізавана платнае аматарскае рыбалоўства. Летам тут выцягваюць карпаў вагой да 25 кілаграмаў, амураў да 20 кілаграмаў, а таксама карасёў, шчупакоў, акунёў, таўсталобікаў...



Угоддзі лесапаляўнічай гаспадаркі таксама багатыя на трафеі. Турыст можа быць упэўнены ва ўдалым паляванні на дзіка, пушных звяроў і птушак. Таксама можна пайсці на ціхае паляванне на лекавыя расліны, грыбы ці ягады або «паляваць» з фотаапаратам на прыгожыя краявіды і дзікіх жывёл. Для дастаўкі рыбаловаў і паляўнічых на месца ёсць маторная лодка, снегаход і аўтамабіль УАЗ.

## Экалагічная сцежка з цымбаламі

**Галоўны ляснічы Міхаіл КАНАПАЦКІ** расказвае, што для ўзаемадзеяння з мясцовымі ўстановамі адукацыі ў Ельскім лясгасе была распрацавана экалагічная сцежка «Вандраванне ў свет прыроды»:

— Сёлета мы адкрылі гэты маршрут, каб стварыць умовы для экалагічнай адукацыі дзяцей, развіваць экалагічную культуру праз фарміраванне практычнага досведу прыродакарыстання.

Экалагічная сцежка — гэта ўчастак зямлі каля двух гектараў, на якім расце шэсць лесаўтваральных парод дрэў. Тут знаёмыя ўсім бяроза, хвоя, ліпа, клён, рабіна, асіна і дэкаратыўныя расліны.

Нікога не пакідаюць абыякавымі «лясныя цымбалы». Кожнае дрэва мае свой унікальны гук. «Лясная сцежка здароўя і перашкод» паспрыяе ўмацаванню імунітэту і нервовай сістэмы, паляпшэнню каардынацыі рухаў і масажу ступняў ног.





**Намеснік дырэктара Таццяна НІКІТКО** кажа, што вынік работы Ельскага лясгаса ўрэшце зводзіцца да галоўнага паказчыка — дастойнай заработнай платы, якая ў тэрмін паступае да работнікаў:

— У нашым лясгасе працуюць 360 чалавек. Па выніках работы за 11 месяцаў іх сярэднямесячная зарплата склала 949 рублёў. Мы пастаянна паляпшаем умовы працы ва ўсіх нашых падраздзяленнях. У нас ёсць патэнцыял, ёсць працаздольны калектыў, які робіць усё магчымае, каб упэўнена крочыць наперад.

УНП 400034313.

# ЕЛЬСКІ ГАРОШАК ДА НАВАГОДНЯГА АЛІЎЕ




**У зялёным гарошку бялку не менш, чым у ялавічыне (18—20 г на 100 г гарошку). Гэты прадукт дапамажа папоўніць бялковы запас падчас дыет і пастоў, асабліва ў спалучэнні з крупамі. У гарошку шмат лецыціну і ненасычаных тлустых кіслот, якія добра ўздзейнічаюць на сардэчна-сасудзістую сістэму.**

**Вельмі разнастайны асартымент кансерваў з садавіны і агародніны выпускае ААТ «Ельскі кансервавы завод». Асноўную долю ў аб'ёме прадукцыі займаюць кансерваваны зялёны гарошак і сокі. Увогуле ж асартыментны пералік прадукцыі ААТ «Ельскі кансервавы завод» налічвае больш за 60 найменняў, гаворыць дырэктар прадпрыемства Генадзь РАДУЧЫЧ:**



— Мы выпускаем пладова-ягадныя, фруктовыя і агароднінныя сокі, нектары, сок бярозавы, павідла, зялёны гарошак кансерваваны, агароднінныя кансервы, агароднінную ікру, марынады, соусы. Галоўным чынам для вытворчасці кансерваў выкарыстоўваецца мясцовая сыравіна — яблыкі, зялёны гарошак, морква, капуста, агуркі, таматы і іншае, вырашчаная сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі і насельніцтвам Ельскага, Мазырскага, Калінкавіцкага і іншых раёнаў вобласці.

Прадпрыемства сёння валодае ўсімі тэхнічнымі магчымасцямі для вытворчасці высакаякаснай прадукцыі. Для гэтага на заводзе працуе некалькі ліній:

— па вытворчасці зялёнага гарошку;

— па вытворчасці пладоваагародніннага пюрэ з наступным асептычным захоўваннем;

— па вытворчасці нектараў з мякаццю і аднаўленых сокаў;

— па вытворчасці салатаў і абедзенных кансерваў.

**Вядучы інжынер-тэхнолаг прадпрыемства Настасся БЫЧКОЎСКАЯ** адзначае, што асноўная перавага прадукцыі, якую вырабляюць у Ельску, — максімальная натуральнасць:

— Мы не выкарыстоўваем ніякіх кансервантаў. Максімум — гэта аскарбінавая кіслата — яна ідзе як антыакісляльнік пры вытворчасці пюрэ паўфабрыкатаў, і лімонная кіслата — як рэгулятар кіслотнасці. Ніякіх іншых дабавак не выкарыстоўваем. Мы працуем па рэцэптурах і тэхналагічнай дакументацыі, набытай у навукова-практычным цэнтры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні. Цяпер пачалі распрацоўку рэцэптур і ў нашай лабараторыі. Уся сыравіна паступае на перапрацоўку, і гатовая прадукцыя праходзіць строгі кантроль.



Аператары лініі вытворчасці харчовай прадукцыі Юлія БУРМІЧ і Галіна ГАЛУМБІЕЎСКАЯ.

Гаспадыні, вельмі занятыя на рабоце, паспелі ацаніць абедзенную групу кансерваў, якую вось ужо год, як выпускаюць на Ельскім кансервавым заводзе. Сапраўды, вельмі зручна купіць слоік з нарыхтоўкай і хуценька прыгатаваць гарачую смачную страву.

У 2009 годзе на заводзе была праведзена мадэрнізацыя і ўстаноўлена абсталяванне па вырабе паўфабрыкатаў асептычнага кансервавання. Адначасова — лінія па вытворчасці нектараў. Гэта дало магчымасць загадзя нарыхтаваць паўфабрыкаты, з якімі потым прадпрыемства працуе ў міжсезонне. Так, яблыкі, якіх сёлета было вельмі шмат на Гомельшчыне, ужо нарыхтаваны і ператвораны ў пюрэ. Прадукт доўга захоўваецца, каб паступова, практычна да наступнага сезона, з яго вырабляць нектары садавінныя з мякаццю. Гэта дазваляе пастаянна загружаць вытворчасць і забяспечваць працоўны калектыў работай і заробкам.

Самы ліквідны тавар Ельскага завода — любімы многімі зялёны гарошак. Практычна ў кожнай гаспадыні такі слоік (і не адзін) прызапашаны для навагодняга аліўе. Дарэчы, вырошчваннем гарошку займаюцца дзве гаспадаркі раёна: КСУП «Ельск» і КСУП «Дабрынь». Спецыяльны камбайн, які належыць Ельскаму кансерваваму заводу, з канца чэрвеня да сярэдзіны жніўня ўбірае гарошак, які потым пастаўляецца на прадпрыемства.

— Вельмі важна вытрымаць тэрміны збору маладога гарошку і своечасова закрыць яго ў слоік, — расказвае дырэктар завода Генадзь Радучыч. — Каб расцягнуць сезон перапрацоўкі, спачатку садзяць раннія сарты, потым — сярэдняспелыя і потым познія.

Дарэчы, пра слоікі. Уся прадукцыя Ельскага кансервавага завода — у самай экалагічнай шкляной тары. Прадукцыя адкрытага акцыянернага таварыства даўно заваявала давер спажыўцоў.



Яна пастаўляецца прадпрыемствам гандлю і грамадскага харчавання, адукацыйным і аздараўленчым установам. Яе ахвотна закупляюць камбінаты школьнага харчавання, бальніцы і іншыя сацыяльныя ўстановы.

**Матэрыялы падрыхтавала Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

УНП 400008290.

Нефармат

# НАЙВЯЛІКШАЕ ШЧАСЦЕ



Пішу з пажаданнем табе, дарагі чытач, ніколі не сустракаць Новы год на бальнічным ложку, асабліва ў аддзяленні траўматалогіі. І для гэтых нататак ёсць як мінімум дзве нагоды. Папершае, ведаю, што гэта такое: летась за два дні да Новага года выпісалася з бальніцы, але яшчэ і пасля гэтага доўга працягвала амбулаторнае лячэнне. Па-другое, днямі давялося наведаць аддзяленне траўматалогіі, праўда, у якасці карэспандэнта.

Аддзяленне ўрачыста адкрылі пасля рэканструкцыі, рамонту і замены абсталявання. А дзясятак гадоў таму выпала правесці тут шмат гадзін у іншай якасці, бо мяне рабілі аперацыю па замене сустава. І многае ўспомнілася. Найперш людзі — урачы, медсёстры, санітаркі. Большасць з іх і цяпер працуюць, і загадчык аддзялення той самы. Пра яго нам, як толькі трапілі ў палату, расказала маладая пацыентка Галя, якая рыхтавалася да выпіскі. Яна нібы на крылах лётала. І па ёй нізавошта не сказаў бы, праз якія пакуты прайшла гэтая жанчына. «А мяне загадчык аддзялення ўсю перарабляў», — бойка адказала на маё пытанне, якое тут усе задаюць аднаму.

— Як гэта?

— А вось так. Хуткая прывезла ў адну з бальніц з трайным пераломам нагі. Здаецца, злажылі, паправілі. Аказалася, не так, зраслося няправільна, нага крывая, хадзіць не магу. За год з невялікім стала нехадзячым інвалідам другой групы. Не хацеў брацца спачатку і наш доктар, але ж умаліла. І вось — зноў аперацыя, зноў ламалі ўсё наноў і наноў складвалі. Цяпер з палачкай ужо хаджу, месяц тут прабыла, а сёння муж па мяне прыедзе... А вам пашанцавала, — звярнулася Галя ўжо на адыходзе да сваіх састарэлых таварышак па палаце. — Вы адразу да гэтага доктара трапілі.

Старых людзей тут было многа. Каб зламаць косць сцягна, не трэба падаць з вышыні, дастаткова аступіцца. А некаторыя нават не падаюць, у іх пераломы здараюцца адвольна ад любога руху. Выйсцем бывае аперацыя па замене касцей на пратэз. Памятаю, як малады доктар нашага аддзялення тлумачыў былой настаўніцы з Пружанскага раёна неабходнасць узяць з сабой сертыфікат на пратэз: «А раптам у самалёце будзеце ляцець, металашукальнік зазвініць, як вы растлумачыце?» Яна ж толькі адмахвалася, маўляў, нікуды я не палячу. Любоў Мацвееўна была такой жвавай і актыўнай, што нават перабаршчыла з апошнім. Як толькі ўстала на ногі, вырашыла, што яна можа добра хадзіць, пайшла самастойна, упала і зламала руку. Як той казаў: і смех, і грэх. Уваччу стаіць, як ушчуваў яе загадчык аддзялення: «Вось прыедзе ваш сын ды адлупцуе мяне, што недагледзелі вас!» І сапраўды, з пажылымі часам трэба столькі цярпення і спагады, як з малымі дзецьмі.

Спагада тут патрэбная ўсім, бо кожнага прыводзіць на бальнічны ложак свая бяда. Побач з маёй мамай ляжала маладая прыгожая жанчына. Працавала раней у Лацінскай Амерыцы, свабодна размаўляе на трох замежных мовах. Расказвала, якая цікавая ў яе работа зараз, уладкаванае жыццё. Яе выпадак, мусіць, пабіў рэкорд па недарэчнасці (але ж хіба траўма наогул можа быць дарэчы?). Была ў гасцях у найлепшых сяброў, падчас вечарынкі выйшла на веранду і наступіла на люк, якім закрываўся спуск у падвал. Накрыўка праламалася, жанчына ўпала ў склеп паўтараметровай вышыні, паламала пазваночнік. Перад гэтым госці праходжваліся туды-сюды, па накрыўцы той прайшлі не менш за пяць чалавек, пераважна мужчыны, значна цяжэйшыя за яе. Сапраўды, як у бессмяротным рамане Булгакава: «Не ведаеш, хто гэтую нітачку падвесіў і хто калі яе перарэжа».

Да сімпатычнай Алены наведваўся яе знаёмы, дарэчы, гаспадар таго злашчаснага падвала, і звяртаўся не іначай як: «Ну здароў, прыгажосць!» А «прыгажосць» ужо месяц ляжала на спецыяльным прыстасаванні, якое дазваляе не дакранацца да пасцелі спінай, па сутнасці — вісела. Пра тое, каб прыўстаць ці павярнуцца, зразумела, гаворкі не вядзецца. Але ж ёй яшчэ пашанцавала, бо праз колькі месяцаў яе абяцалі падняць на ногі. Пашанцавала, бо пасля такіх траўмаў гэта ўдаецца зрабіць не ўсім.

Была нагода радавацца за яе не толькі па прычыне аптымістычных прагнозаў, але яшчэ і таму, што яна не страчвала прысутнасці духу. Ніколі не дазваляла сабе паказваць свае пакуты на людзях, плакаць, шкадаваць сябе. Зранку — абавязковы макіяж (рукі ж рухаюцца), вечарам прыходзіў 20-гадовы сын, часта мыў ёй галаву. Выглядала заўсёды бездакорна і ў палаце выконвала ролю своеасаблівага псіхатэрапеўта. Не раз цытавала класікаў, гаварыла, што нават у самых страшных умовах многія знаходзілі сілы заставацца людзьмі.

Усё так. І падобныя сустрэчы даюцца, відаць, для таго, каб асэнсаваць, што калі ты сам у больш-менш нармальным самаадчуванні, на сваіх нагах і можаш сустрэць Новы год ва ўласным доме пад ёлкай у коле блізкіх людзей, то гэта і ёсць найвялікшае шчасце.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.28 | 16.53 | 7.25 |
| Віцебск — | 9.26 | 16.35 | 7.09 |
| Магілёў — | 9.19 | 16.43 | 7.24 |
| Гомель — | 9.06 | 16.48 | 7.42 |
| Гродна — | 9.42 | 17.10 | 7.28 |
| Брэст — | 9.34 | 17.19 | 7.45 |

### Месяц

*Поўня 22 снежня.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

### Імяніны

*Пр. Калініка, Мікалая, Філімона.*
*К. Жанэты, Максіма, Тодара, Цэзара, Яна.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

**27 СНЕЖНЯ**



**1595** год — войскі Вялікага Княства Літоўскага разграмілі казацкія загоны гетмана войска Запарожскага Севярына Налівайкі каля вёскі Буйнічы (на Буйніцкім полі ў ваколіцах Магілёва).

**1847** год — нарадзіўся (в. Турын, цяпер у Пухавіцкім раёне) Якуб Атонавіч Наркевіч-Ёдка, беларускі прыродазнавец, вынаходнік, медык, доктар медыцыны, прафесар, член-карэспандэнт Рускага геаграфічнага таварыства. У 1865 годзе скончыў Мінскую губернскую гімназію, працягваў вучобу ў Парыжы, Фларэнцыі, Вене; вывучаў фізіку, медыцыну. У 1888 годзе стварыў у сваім маёнтку Наднёман метэаралагічную станцыю. Даследаваў атмасферную электрычнасць. Рэгістраваў навальнічныя разрады з дапамогай тэлефона і прадказваў набліжэнне навальніцы. У сваім маёнтку адкрыў санаторый для лячэння хворых на сухоты. Прапанаваў выкарыстанне метаду электраграфіі для дыягностыкі захворванняў. З 1892 года — член-супрацоўнік фізіка-хімічнага таварыства пры Пецярбургскім універсітэце. Памёр у 1905 годзе.



**1908** год — нарадзіўся Васіль Піліпавіч Маргелаў (г. Днепрапятроўск, Украіна), Герой Савецкага Саюза, генерал арміі, кандыдат ваенных навук. Беларус. Удзельнік савецка-фінскай вайны. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 года на Ленінградскім, Паўночна-Заходнім, Сталінградскім, Паўднёвым, 3-м і 4-м Украінскіх франтах: камандзір палка, начальнік штаба дывізіі, камандзір дывізіі. Удзельнік баёў пад Ленінградам, Сталінградам, на Дняпры, Днястры, у Румыніі, Балгарыі, Югаславіі, Чэхаславакіі, Венгрыі, Аўстрыі. З 1946 года — на адказных пасадах у Савецкай Арміі, у 1954—1959 гадах і 1961—1979 гадах — камандуючы савецкімі паветрана-дэсантнымі войскамі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1975). Памёр у 1990 годзе.

**1923** год — нарадзіўся (вёска Машканы Сенненскага раёна) Анатоль Вялюгін, беларускі паэт, кінасцэнарыст, перакладчык, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. Аўтар паэтычных зборнікаў «Салют у Мінску», «Песня зялёнага дуба», сцэнарыяў дакументальных фільмаў «Генерал Пушча», «Балада пра маці» і іншых. Пераклаў на беларускую мову асобныя творы М. Лермантава, У. Маякоўскага, Л. Украінкі і іншых аўтараў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, Літаратурнай прэміі імя Я. Купалы. Памёр у 1994 годзе.



**1938** год — указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР устаноўлена найвышэйшая ступень адзнакі — званне Герой Сацыялістычнай Працы. Яно прысвойвалася асобам, якія сваёй дзейнасцю ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарту, гандлю, навуковых адкрыццяў і тэхнічных вынаходак праявілі выключныя заслугі перад дзяржавай, садзейнічалі ўздыму народнай гаспадаркі, развіццю культуры, навукі, росту магутнасці і славы СССР. Герою Сацыялістычнай Працы ўручалі ордэн Леніна, залаты медаль «Серп і Молат» і грамату Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. У Беларусі званне Героя Сацыялістычнай Працы было прысвоена 539 чалавекам (на 1991 год).

**1948** год — нарадзіўся Жэрар Дэпардзьё, вядомы французскі акцёр тэатра і кіно. Здымаўся ў фільмах «Дантон», «Відок», «Набярэжная Арфеўр, 36» і інш. Лаўрэат шматлікіх прэстыжных еўрапейскіх кінапрэмій.

## УСМІХНЕМСЯ

**Вельмі сумленны прадавец фальшывых дыпломаў пры продажы задае пакупніку некалькі дадатковых пытанняў па спецыяльнасці.**

— Вой, як смачна ў цябе атрымалася! Ты сам гатаваў?

— Жонка дапамагала.

— Разумніца якая! І як жа яна табе дапамагала?

— Не лезла з парадамі...

**— Язычок пакажыце.**

**— А-а.**

**— Ды не той. Я ж шавец, а не доктар.**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4536.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 26 снежня 2018 года.